ЯК ТАННА КУПЛЯЦЬ ПРАДУКТЫ 7

ПАСЯЎНЫ КАЛЯНДАР НА 2020 ГОД 8-9

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

29 СТУДЗЕНЯ 2020 г. СЕРАДА № 18 (29132)

ЛІЧБА ДНЯ

2198

зваротаў грамадзян паступіла ў Нацбанк у 2019 годзе (у 2018 годзе — 2032). Часцей сталі звяртацца з нагоды крэдытавання: 514 зваротаў, ці 23 % ад агульнай колькасці (у 2018 годзе — 439 зваротаў). Колькасць скаргаў аб неабгрунтаванай адмове ў крэдыце знізілася з 92 у 2018 годзе да 81 у 2019-м. Разам з тым амаль у два разы больш стала зваротаў грамадзян аб абмежаванні іх сваякоў у праве на атрыманне крэдытаў у банках (28 зваротаў супраць 15 у 2018 годзе). Менш сталі звяртацца па ўкладах (85 зваротаў у 2018-м і 76 у 2019-м). Пры гэтым працягвае павялічвацца колькасць зваротаў па пытаннях кампенсацыі ўкладаў савецкага перыяду (у 2018 годзе 44 звароты, у 2019-м — 50 зваротаў). Больш чым на 50 % летась павялічылася колькасць зваротаў, якія датычацца банкаўскіх картак, банкаматаў, інфакіёскаў (у 2019 годзе іх было 348, у 2018-м — 230).

КАРАТКА

- **Беларусы могуць з'ехаць з кітайскай правінцыі Хубэй на падставе запыту нашага пасольства ў КНР.**
- Банк развіцця ў 2020 годзе накіруе на фінансаванне дзяржпраграм і мерапрыемстваў 967 мільёнаў рублёў.
- **Сталічная каманда прайшла адбор на чэмпіянат свету па «Што? Дзе? Калі?».**
- Узвядзенне анкадыспансера ў Гродне стане абласной маладзёжнай будоўляй.
- **У Мінску сёлета плануецца капітальна адрамантаваць 1,4 мільёна квадратных метраў жылля.**

ISSN 1990 - 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«У нас ёсць усё для таго, каб нармальна плыць і не патануць»

Фота БелТА.

Прэзідэнт запатрабаваў «расшавяліць» Віцебскую вобласць

Пытанням аграпрамысловага комплексу Віцебшчыны ў лістападзе была прысвечана асобная нарада ў цэнтральным горадзе вобласці. «Рэанімаваць» гаспадарку рэгіёна прыязджаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. Сустрэча павінна была стаць гістарычнай па выпраўленні эканамічнага стану ў сельскай гаспадарцы рэгіёна. Цягам апошніх гадоў усе асноўныя паказчыкі гэтай сферы «мінусавалі».

Удзельнікі нарады тады прапанавалі кіраўніку дзяржавы сваё бачанне выйсця з сітуацыі, такое ж маштабнае, як і праблемы, — стварэнне супербуйнога холдынга, які зойме 2/3 тэрыторыі рэгіёна. Прэзідэнт ідэю мегааб'яднання не падтрымаў, параіў не адмаўляцца ад сыравінных зон, адрэгуляваць цэны для існуючых інтэграцыйных структур, дазволіць прыватызацыю праблемных гаспадарак і даць адтэрміноўку ў выплаце даўгоў рэгіёна.

СТАР. 2

ГАЛОЎНАЕ СЛОВА — «СЯМЕЙНЫ»

Фота БелТА.

Вераніка і Ангеліна — выхаванкі сямейнага дзіцячага дома, які літаральна ўчора справіў навасселле ў Ленінскім раёне Брэста. У абласным цэнтры гэта ўжо восьмая па ліку падобная ўстанова. На пачатку яго будаўніцтва быў аб'яўлены конкурс на пасаду бацькоў-выхавацеляў. Цяпер у двухпавярховым катэджы будуць жыць Сяргей і Вольга Брух, якія, прайшоўшы спецыяльнае навучанне, узялі на выхаванне сямярых дзяцей, што засталіся без апекі бацькоў. Самі сужэнцы — бацькі 11-гадовай дзяўчынкі і сына-дашкольніка, так што дзяўчынкам, якія на фота з задавальненнем пазіруюць у сваім пакоі, дакладна будзе не сумна ў вялікай сям'і, бо галоўнае слова ў назве іх новага дома — «сямейны».

ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

УТАЙМАВАЦЬ «СТРАЛУ»

Чаму падаюць краны?

На стужкі навін перыядычна трапляе інфармацыя пра надзвычайныя здарэнні з грузапад'ёмнымі кранамі на будаўнічых пляцоўках. Летась іх адбылося дванаццаць. Прычым тры з іх скончыліся смерцю, а чатыры мелі цяжкі зыход.

Летась Дзяржпрамнагляд праверыў 184 пляцоўкі. Рэвізія датычылася некалькіх кірункаў. Па-першае, таго, у якім стане знаходзяцца грузапад'ёмныя краны, наколькі кваліфікавана і дасведчана працуе іх абслуговы персанал. Па-другое, асобная ўвага звярталася на тое, ці карэктна вядзецца арганізацыйна-распарадчая дакументацыя, якая рэгламентуе парадак выканання работ. І, па-трэцяе, наколькі выконваюцца патрабаванні правіл прамысловай бяспекі падчас эксплуатацыі грузапад'ёмных кранаў.

Інспектары ведамства знайшлі больш за шэсцьсот парушэнняў. Сумным лідарам тут з'яўляецца сталіца, на чыю долю прыпадае амаль палова ад выкрытых хібаў. Усе яны насілі арганізацыйны характар.

СТАР. 7

Фота дадзена Дзяржпрамнагляду.

«У нас ёсць усё для таго, каб нармальна плыць і не патануць»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Тады ж Аляксандр Лукашэнка даручыў кіраўніцтву рэгіёна, ураду, вышэйшым службовым асобам краіны да студзеня 2020 года дапрацаваць прапановы па вывядзенні АПК вобласці на маршрут устойлівага развіцця. Учора на нарадзе ў Палацы Незалежнасці кіраўнік дзяржавы выслухаў і абмеркаваў новыя прапановы.

Фота БелТА.

Што вінен, аддаць павінен

Прэзідэнт адразу адзначыў, што гэта павінен быць канчатковы разгляд прапаноў па выпраўленні сітуацыі ў АПК Віцебшчыны. Пры гэтым праблемы, вынесеныя на абмеркаванне, характэрныя для ўсіх абласцей.

«У прадстаўленых да нарады матэрыялах асноўны ўпор пакуль зроблены на меры дзяржаўнай падтрымкі. Калі гэта адзінае, з чым вы сюды прыйшлі, то мы дарма страцім час», — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка на пачатку размовы і дадаў, што пытанне не столькі ў грашах, колькі ў тым, ці зробленыя сур'ёзныя высновы па ўсіх праблемах.

«Ці ёсць вывераныя вытворчыя і фінансавыя планы? Як будзе наведзены парадак у гаспадарчай дзейнасці, і ці ведае кіраўнічая вертыкаль Віцебшчыны, што ёй рабіць далей», — задаў пытанні прысутным Прэзідэнт.

— Памятаеце, я вам гаварыў, што да гэтай нарады вы павінны страсянуць усе сельскагаспадарчыя прадпрыемствы — калгасы і саўгасы (будзем казаць па-старому, каб усім было зразумела). Дамоўцеся з механізатарамі і даяркамі. Я ўжо не кажу пра кіраўнікоў гэтых гаспадарак. Складзіце дамовы, стварыце пэўнае максімальнае напружанне зверху данізу, — напомніў сваё даручэнне Прэзідэнт і папярэдзіў: калі дзяржава зробіць адпаведныя крокі насустрач, то давядзецца працаваць так, каб не толькі вярнуць даўгі, але і вывесці прадпрыемствы на бясстратную работу.

Так, людзей трэба прымусіць працаваць, але каб патрабаваць гэта, неабходна плаціць нармальныя заробкі. А тым, хто імкнецца зарабіць больш, каб накарміць вялікую сям'ю, — дапамагчы.

Прэзідэнт пацікавіўся: якім чынам прапануецца вырашыць гэту праблему і чым кіраўніцтва рэгіёна і ўрада разлічвае не толькі ўтрымаць людзей на вёсцы, але і прыцягваць новых, высакакласных спецыялістаў?

«Калі мы пойдзем на абнаўленне арганізацыйнай сферы АПК вобласці, то дзе возьмем спецыялістаў? Ці ёсць яны ў вас? Мы даўно казалі, што нам неабходна Віцебскую вобласць істотна ў сельскай гаспадарцы мадэрнізаваць. Але ні адзін з урадаў далей за размовы не пайшоў», — абурыўся кіраўнік дзяржавы.

Цэнтральнае пытанне да ўсіх удзельнікаў нарады — ці атрымалася ва ўрада і Віцебскага аблвыканкама выпрацаваць універсальныя меры, якія можна ўжываць у іншых рэгіёнах краіны?

«Галоўнае, што зроблена правільна ў Віцебскай вобласці, — мы пайшлі ад патрэб, ад перапрацоўшчыкаў. Уключылі ў холдынгі калгасы і саўгасы. Калі ласка, дайце нам малако і мяса. Калі не разумеюць колькі, давядзіце да іх пэўныя аб'ёмы, якія павінны выдаць перапрацоўшчыкам, і няхай выконваюць, — адзначыў лідар дзяржавы. — Планы павінны быць настолькі напружаныя, каб забяспечыць сваю гаспадарчую дзейнасць і вярнуць даўгі».

Аб'яднаць вёску з заводам

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Шарснёў далажыў Прэзідэнту аб праекце ўказа аб развіцці аграпрамысловага комплекса Віцебскай вобласці.

У рамках указа прапануецца стварыць сем аб'яднанняў на базе перапрацоўчых прадпрыемстваў рэгіёна: Віцебскі мясакамбінат, Глыбоцкі малочна-кансервавы камбінат, Полацкі малочны камбінат, Аршанскі мясакамбінат, Віцебскі малочны завод, Верхнядзвінскі масласырзавод, Пастаўскі малочны завод. Каля паўтары сотні сельскагаспадарчых арганізацый, якія не ў стане працаваць самастойна, прапануецца аб'яднаць у сыравінныя зоны гэтых перапрацоўчых прадпрыемстваў. Такія зоны ствараліся і раней, пачынаючы з савецкіх часоў. Адрозная рыса новых — акрамя разлікаў за атрыманую сыравіну, кіраўніцтва перапрацоўчых прадпрыемстваў, па словах Мікалая Шарснёва, будзе займацца іх развіццём і несці адказнасць за абнаўленне матэрыяльнай базы, аказваць фінансавую, тэхналагічную і практычную дапамогу.

Пры гэтым роля старшынь райвыканкамаў не зменшыцца, запэўніў кіраўнік вобласці. «У іх з'явяцца дадатковыя фінансавыя і матэрыяльныя рэсурсы для развіцця сельгасарганізацый, якія знаходзяцца на тэрыторыі раёна. У іх функцыі нязменна ўваходзяць кіраванне прадпрыемствамі, кадравая палітыка, забеспячэнне выканання вытворчых паказчыкаў, бясстратная работа арганізацый», — удакладніў ён.

Віцебскім абласным выканаўчым камітэтам, што з'яўляецца ўласнікам маёмасці галаўных арганізацый аграпрамысловага аб'яднання, прызначаюцца прадстаўнікі дзяржавы з ліку работнікаў аблвыканкама, асноўнымі функцыямі якіх будуць вызначэнне стратэгіі развіцця, павышэнне эфектыўнасці сістэмы кіравання, кадравая палітыка.

У якасці мер фінансавага аздараўлення праектам указа прапануецца частку даўгоў (запазычанасць перад бюджэтам, фондам сацыяльнай абароны насельніцтва і іншыя) перадаць арганізацыі па кіраванні даўгамі з далейшымі растэрміноўкай і адтэрміноўкай. Такую арганізацыю прапануецца стварыць пры аблвыканкаме. «Для пагашэння гэтых даўгоў сельгасарганізацыі будуць адлічваць адзін працэнт ад выручкі, перапрацоўчыя — тры працэнты», — паведаміў Мікалай Шарснёў.

Прэзідэнт выказаў сумненні ў мэтазгоднасці стварэння новай фінансавай структуры, тым не менш выслухаў усіх: ад намесніка сваёй Адміністрацыі да кіраўніцтва Акадэміі навук.

«Гаворка аб спісанні даўгоў ісці не павінна, — падкрэсліў ён. — Вярніце даўгі. Можна абмяркоўваць толькі тое, што мы вам дадзім нейкую аддушыну, каб вы маглі глынуць свежага паветра».

Паводле слоў прэм'ер-міністра Сяргея Румаса, аграпрамысловы комплекс вобласці назапасіў даўгоў на Br3 млрд. Спецыялісты прапрацоўвалі розныя варыянты, што рабіць з гэтай запазычанасцю, але да адзінага рашэння пакуль не прыйшлі. Патрабаванне Прэзідэнта адно: так ці інакш грошы павінны быць вернутыя.

«Пры ўсёй макраэканамічнай стабільнасці ў нас праблем хапае ў эканоміцы, таму трэба зыходзіць з гэтага, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Альбо пакідайце гэтыя даўгі ў калгасах і саўгасах (мы іх адтэрмінуем, і банкі будуць на іх у перыяд адтэрміноўкі нармальна глядзець, а не каэфіцыенты лічыць), альбо мы перададзім гэтыя даўгі галаўному прадпрыемству, альбо акумулюем у агенцтве [прапанова Мікалая Шарснёва. — **«Зв.»**]».

Размова ідзе пра «тэхнічную расчыстку» балансаў прадпрыемстваў, каб за імі не лічылася даўгоў. Гэта дазволіць аўтаматычна палепшыць каэфіцыенты плацежаздольнасці прадпрыемстваў, яны стануць больш прывабнымі пазычальнікамі.

«Але абавязкова яны хоць па цэнце, па рублі павінны плаціць. Няхай у гэтым годзе мы ім скажам: давайце паглядзім, як будзеце працаваць, — чапаць не будзем. Ад 1 студзеня наступнага года яны хоць рубель павінны плаціць, ***яны павінны ведаць, што па даўгах трэба разлічвацца, ніякага спісання!»*** — паўтарыў кіраўнік дзяржавы цвёрдае правіла для ўсіх гаспадарчых суб'ектаў краіны.

Галоўная апора — людзі

Прэзідэнт асобна спыніўся на прапанаванай у праекце ўказа кадравай палітыцы. Ён выказаў сумненне ў эфектыўнасці схемы, калі кіраўнік сельгасарганізацыі працуе ў штаце галаўнога прадпрыемства.

«Ёсць кіраўнік — ёсць прадпрыемства, — падкрэсліў ён. — Асабліва на вёсцы. Вы яго цяпер выдзіраеце адтуль, прымаеце на работу, скажам, на Віцебскім мясакамбінаце, і даяце яму паперку: будзеш па даверанасці кіраваць (сельгасарганізацыяй — **«Зв.»**). Дык ён скажа вам: «Дзякуй. Я там працую, а не тут». Псіхалагічна. Не разумею, навошта вы тут юрыдычную казуістыку прапануеце».

Паўнамоцтвы кіраўнікоў раёнаў ні ў якім разе не павінны быць ушчамлёныя, бо раён і, перш за ўсё, сельгаспрадпрыемствы — іх прамая адказнасць, паўтарыў сваё ранейшае патрабаванне Аляксандр Лукашэнка.

«З вас будзе попыт жалезны, — звярнуўся ён да прадстаўнікоў гэтага звяна выканаўчай улады. — Вы ж не думаеце, што пройдзе год, і вы зноў прыйдзеце і даложыце, што малака трохі больш стала, а вынікаў фінансавых няма. Нам і без Віцебска малака сёння хапае. Пытанне — у выратаванні вобласці і сялян. А каб іх выратаваць, іх трэба там аб'яднаць і прымусіць працаваць. І заплаціць ім грошы. І сказаць: вось малако і мяса, якія мы павінны абавязкова на галаўное прадпрыемства паставіць».

«Мы вызначыліся, што ў Віцебскай вобласці робім мяса і малако, — нагадаў спецыфіку рэгіёна Аляксандр Лукашэнка. — На збожжа там нельга налягаць. Мільён тон атрымалі — гэта для камбікармоў. Паўтара мільёна атрымаеце — добра. Але там трэба на травах спецыялізавацца. Даўно ўжо вучоныя нас да гэтага схіляюць. ***Мы вызначыліся: вырошчваем на зямлі кармы, каб мець малако і мяса».***

Да 2025 года неабходна атрымаць звыш аднаго мільёна тон малака для поўнай загрузкі малочных перапрацоўчых заводаў пры сярэднім удоі на карову 5500 кілаграмаў, то-бок за пяць гадоў прырасці на 1500 кілаграмаў, што рэальна.

«У гэтым годзе, можа, нават і ў наступным, подзвігі мы будзем здзяйсняць з тымі людзьмі, якія ў нас ёсць, і на той базе, якая ў нас сёння створана ў Віцебскай вобласці», — акцэнтаваў увагу Прэзідэнт, арыентуючы дзяржслужачых на работу па аднаўленні гаспадарак — машынных двароў, зернетакоў, комплексаў фермаў, працоўнай дысцыпліны.

На думку Прэзідэнта, ***сёння на Віцебшчыне ў эканоміцы павінна быць «жорсткая дысцыплінарная і тэхналагічная дыктатура».***

Член Савета Рэспублікі Міхаіл Русы, які быў і міністрам сельскай гаспадаркі, і віцэ-прэм'ерам, які курыраваў сферу АПК, запэўніў Прэзідэнта, што структура кіравання вобласці не будзе зменена: «Упершыню адміністрацыйна замацоўваем сыравінныя зоны. ***Усе гаспадаркі будуць прымацаваныя да перапрацоўчага прадпрыемства. Іх задача — забяспечыць апошнія сыравінай, каб атрымаць дадатковы прыбытак.*** Задача кіраўніка галаўной арганізацыі разам са старшынёй райвыканкама — нарасціць вытворчасць, стварыць тэхналагічныя групы, навесці парадак у абсталяванні, кантролі. І адсочваць бізнес-план па стварэнні кармавой базы».

Як «памаладзіць» кадры?

Прэзідэнт загадаў праверыць інфармацыю міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Анатоля Хацько аб мэтавым накіраванні ў ВНУ сельскагаспадарчага профілю выпускнікоў профільных класаў Віцебскай вобласці. А самому міністру параіў паехаць у адну з вясковых школ, паразмаўляць там з маладымі людзьмі і настаўнікамі і запрасіць выпускнікоў на вучобу ў профільныя навучальныя ўстановы.

Што датычыцца прапановы аб даплаце маладым спецыялістам, то яна можа быць не з рэспубліканскага бюджэту, адзначыў Аляксандр Лукашэнка, а з рэгіянальнага. А яшчэ лепш — са спецыяльна створанага з дапамогай спонсараў фонду. «Я супраць даплат, — заўважыў пры гэтым Прэзідэнт. — Зарплату ўстанавіце нармальную, і будзеце пералічваць гэтаму калгасу-саўгасу энную суму на заробак кіраўніку і спецыялістам». Рэспубліканскі бюджэт не павінен быць крыніцай сродкаў для рэалізацыі ўказа ні ў якіх выпадках, запатрабаваў кіраўнік дзяржавы.

«Што датычыцца жылля, гэта найважнейшае пытанне і для іншых, — спыніўся на наступным пункце абмеркавання Прэзідэнт. — ***У вас усюды ёсць аграгарадкі. У гэтых аграгарадках для кожнага спецыяліста, для пачатку — галоўнага, павінен быць пабудаваны дом».***

Аляксандр Лукашэнка прапанаваў замаўляць такія дамы ў Шклове. «Вось тут плячо падставім», — паабяцаў ён.

Яшчэ адна прапанова — дазволіць маладым спецыялістам права на вайсковую службу ў рэзерве. Лідар дзяржавы загадаў прапрацаваць яе, заўважыўшы, што хлопцы, якія працуюць на сяле, усё роўна ў абавязковым парадку павінны прайсці вайсковую падрыхтоўку.

Яшчэ адно даручэнне кіраўніка дзяржавы — вырашыць пытанне з дазволам на атрыманне правоў кіроўцы аўтатранспарту выпускнікам сельскіх школ, якія атрымалі адпаведную падрыхтоўку, але не дасягнулі 18-гадовага ўзросту.

Напрыканцы нарады Аляксандр Лукашэнка паразмаўляў з людзьмі, якіх прапанавалі на пасады кіраўнікоў новых аб'яднанняў, падкрэсліўшы, што гэта будзе цяжкая і надзвычай адказная работа і важна, каб яны самі хацелі праявіць сябе на ёй.

Не забыць пра надзённасць

Грашовыя сродкі, якія ёсць, трэба сканцэнтраваць на галоўных кірунках, падсумаваў Аляксандр Лукашэнка.

«А галоўны кірунак сёння — падрыхтавацца да вясновай сяўбы. Трэба сёння таксама займацца племянной справай у жывёлагадоўлі. ***Старшыням райвыканкамаў мой наказ — калі бачыце, што ў гаспадарках не хопіць кармоў, але ёсць жывёла, перакіньце яе туды, дзе яна не загіне і дасць прывагу,*** — сказаў Прэзідэнт. — Трэба разварушыць вобласць. Старшыня райвыканкама з заўтрашняга дня ўвогуле не павінен спаць, вобразна кажучы».

На нарадзе прынята рашэнне дапрацаваць праект указа цягам двух тыдняў.

«Мужыкі, я вас вельмі прашу: зразумейце сур'ёзнасць моманту. ***Грошай лішніх няма. Ідзе барацьба не на жыццё, а на смерць: або мы патонем, або застанемся на плаве. Але ў нас ёсць усё, каб нармальна плыць і не патануць.*** Мы павінны гэта вытрымаць. Усё залежыць ад вас там, на месцах. Калі Віцебская вобласць выплыве, то Магілёўская і Гомельская дакладна не памруць. Мінскай і бог загадаў. Астатнія больш-менш працуюць, — такімі словамі завяршыў нараду Прэзідэнт. — Галоўнае пытанне — ***не адцягвайце ўвагу на размовы пра рынкі, фінансы. Будуць фінансы, калі будзе дысцыпліна тэхналагічная і людзі будуць працаваць.*** Прымусьце ўсіх працаваць!»

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА,
Марыя ДАДАЛКА.

У Беларусі каранавіруса пакуль няма,

а ўсіх прыезджых чакае паглыблены кантроль

У Кітаі ўжо зафіксавана 4,5 тысячы пацверджаных выпадкаў захворвання на каранавірус, 976 чалавек знаходзяцца ў цяжкім стане. Колькасць загінулых вырасла да 106, з іх 26 памерла за апошнія суткі. Улады Кітая робяць усё магчымае, каб вірус не распаўсюджваўся за межы краіны, астатнія дзяржавы таксама прымаюць меры бяспекі. У прыватнасці, усіх ахвотных выехаць з КНР будуць змяшчаць у каранцін на 14 дзён, і толькі пасля гэтага яны атрымаюць дазвол на выезд.

У хуткім часе ў Беларусь пасля навагодніх святкаванняў вернуцца кітайскія студэнты, іх у нас вучыцца каля чатырох тысяч. Усе яны пройдуць праз двухтыднёвы каранцін на радзіме.

— Мы іх чакаем са спазненнем, але гэта неабходныя меры бяспекі, — адзначыў **міністр аховы здароўя Беларусі Уладзімір КАРАНІК.**

Ён падкрэсліў, што дадатковыя меры будуць прынятыя і ў аэрапорце «Мінск». Прадстаўнікі медыцынскай службы будуць падымацца на борт кожнага самалёта, які прыляціць, і выяўляць пасажыраў з прыкметамі віруснай інфекцыі. Тыя, у сваю чаргу, будуць асобна праходзіць пагранічны і мытны кантроль, каб мінімізаваць колькасць кантактаў. У найбліжэйшыя дні ў аэрапорце будзе развернуты і лабараторны кантроль. У тых, хто пэўны час правёў у КНР, нягледзячы нават на каранцінныя мерапрыемствы на радзіме, пасля прылёту дадаткова возьмуць аналізы на каранавірус. У аэрапорце ўсе пасажыры атрымаюць памяткі, дзе апісана, як паводзіць сябе пры ўзнікненні рэспіраторных сімптомаў. У прыватнасці, ісці ў паліклініку не рэкамендуецца, лепш выклікаць хуткую дапамогу і растлумачыць, што наведвалі Кітай (ці іншую краіну).

— Мы правялі нараду сумесна з Міністэрствам транспарту і камунікацый, мытным і пагранічным камітэтамі, службамі аэрапорта, прадстаўнікамі «Белавія» і маем поўнае паразуменне ў рэалізацыі плана сумесных дзеянняў, — падкрэсліў Уладзімір Каранік.

Дарэчы, у год у сярэднім Беларусь наведвае каля 23 тысяч грамадзян Кітая, з іх 3,2 тысячы — арганізаванымі групамі. Беларусаў, якія наведваюць Паднябесную, значна менш — каля дзвюх тысяч у год.

— Кітай не з'яўляецца масавым турыстычным напрамкам. На сёння мы маем пяць афіцыйных заяў аб вяртанні грашовых сродкаў іануляванні тураў. З кожным персанальна працуе юрыст, праводзяцца кансультацыі і ў кожным асобным выпадку будзе вынесена рашэнне, — расказаў **намеснік міністра спорту і турызму Міхаіл ПАРТНОЙ.**

Тым часам дзевяць беларусаў знаходзяцца ў кітайскай правінцыі Хубэй (дзе ў асноўным і распаўсюджваецца вірус), двое з іх выказалі намер пакінуць правінцыю.

— Міністэрства замежных спраў знаходзіцца на пастаяннай сувязі з уладамі Кітая і беларускімі грамадзянамі. Калі ўзнікаюць звароты, мы аказваем дапамогу і садзейнічанне, — адзначыў **намеснік начальніка ўпраўлення Азіі і Афрыкі Міністэрства замежных спраў Ігар БЕЛЫ.**

Тым часам медыкі нагадваюць, што новы вірус не такі заразны, як грып, і перадаецца толькі пры цесным кантакце з хворым.

— Ім заразіцца не так проста, павінен быць працяглы кантакт, напрыклад, пры сумесным пражыванні. У зоне рызыкі і медработнікі, якія даглядаюць хворых, — адзначыў Уладзімір Каранік.

Пакуль у Беларусі выпадкаў заражэння каранавірусам няма. Усе, хто звярнуўся пасля паездкі з кашлем, болем у горле, тэмпературай, здалі аналізы. У іх выяўлены грып тыпаў A і B.

Алена КРАВЕЦ.

ПАКАЗАЦЬ СЯБЕ І ТЭХНІКУ Ў ПОЎНАЙ КРАСЕ

«МАЗ-СПОРТаўта» падводзіць вынікі выступлення ў ралі-рэйдзе «Дакар»

«Дакар-2020» стартаваў 5 студзеня ў Джэда і завяршыўся праз 12 дзён у Кідзіі. Працягласць маршруту склала каля 8 тысяч кіламетраў, прычым больш за палову з іх прыпала на спецучасткі. У гонцы ўзяло ўдзел звыш 350 экіпажаў з усяго свету. Толькі ў класе грузавікоў спаборнічала каля 50 «каміёнаў», з іх менш 30 дабралася да фінішу ралі-рэйду.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Капотны МАЗ пад кіраваннем Сяргея Вязовіча з першага разу трапіў на п'едэстал «Дакара», стаўшы трэцім па выніках ралі-рэйду. Гэта другі раз у гісторыі, калі беларускі экіпаж аказваецца на п'едэстале самага прэстыжнага аўтамарафона ў свеце. Нагадаем, для капотніка гэтая гонка стала дэбютам на «Дакары». Беларусы рванулі наперад з першых кіламетраў: занялі другое месца на пачатковым этапе і ішлі лідарамі два наступныя заезды. Пасля гэтага ініцыятыва перайшла да расійскіх экіпажаў, якія «адваявалі» першыя два месцы і паступова павялічылі адрыў. Да найлепшага выніку беларусам не хапіла каля двух гадзін. За трэцяе месца члены экіпажа атрымалі «Залатых бедуінаў» — легендарныя статуэткі для пераможцаў і прызёраў «Дакара».

— Упершыню «Дакар» праходзіў у Саудаўскай Аравіі, — расказвае **начальнік і пілот каманды «МАЗ-СПОРТаўта» Сяргей ВЯЗОВІЧ.** — Таму ў нас было вельмі шмат чаканняў, заснаваных хутчэй на чутках, бо ніхто там раней не быў. Рэальнасць аказалася не такая страшная: гэта даволі цывілізаваная краіна — вядома, са сваімі правіламі, законамі, рэлігіяй, але яны не асабліва датычыліся нас. Клімат таксама быў даволі спрыяльны, бо цяпер там таксама зіма. Сама гонка атрымалася вельмі насычаная спецучасткамі, гэта дзіўна для адной краіны. Мы пачалі з хуткасных участкаў каменных дарог, потым нас чакалі непраходныя камяні і бездарожжа. Гэта дазволіла паказаць сябе і тэхніку ў поўнай красе.

Сяргей Вязовіч таксама адзначыў, што ўсе грузавікі МАЗ дайшлі да фінішу аўтамарафона і вынікі, якія паказала каманда, з'яўляюцца поспехам. Малады беларускі пілот Аляксей Вішнеўскі палепшыў свае дасягненні мінулых гадоў на «Дакары», заняўшы восьмае месца. Шматразовы ўдзельнік ралі-рэйдаў Аляксандр Васілеўскі скончыў гонку на 12-й пазіцыі.

— Капотнік цалкам апраўдаў сябе. Гэта яго першы «Дакар» — вядома, у ім ёсць месцы, якія хацелася б палепшыць, але яны ёсць у любой машыне, — расказвае **намеснік начальніка каманды па тэхнічных пытаннях Рыгор ПАЦКЕВІЧ.** — У нас у планах — паступова перасесці на аўтамабіль такога тыпу. Кожны год знаходзяцца нейкія дробязі, якія мы дапрацоўваем, напрыклад, — пасля гэтай гонкі звернем увагу на сістэму ахаладжэння рухавіка, таму што на некаторых этапах у нас былі да яе пытанні.

Сёлета на бескапотным аўтамабілі, ідэнтычным капотніку па камплектацыі, на якім выступаў Аляксей Вішнеўскі, каманда выпрабоўвала новую аўтаматычную каробку перадач.

Адзначым, што ўдзел у «Дакары», акрамя спартыўных мэт, меў і іншыя задачы. Многія канструктарскія ноу-хау прайшлі выпрабаванне ў «баявых» умовах, што дасць магчымасць удасканаліць і серыйную вытворчасць грузавікоў. Паспяховыя выступленні таксама спрыяльна адбіваюцца на іміджы МАЗ ва ўсім свеце.

— Лепшай рэкламы нашай вытворчасці, чым паспяховае выступленне на самых суровых спаборніцтвах, быць не можа. Гэта, безумоўна, дапамагае прасоўванню і пазнавальнасці маркі ва ўсім свеце, — кажа Сяргей Вязовіч. — Мы ледзьве адбіліся ад кітайцаў, якія ў дзень адпачынку амаль не купілі ў нас капотны грузавік. Была вельмі смешная сітуацыя, калі кітаец стаяў каля нас цэлую гадзіну і хацеў набыць менавіта гэты аўтамабіль. Мы растлумачылі, што ўсё ж такі павінны скончыць гонку *(смяецца)*.

Адзначым, што самы паспяховы для беларусаў стаў «Дакар-2018». Тады Сяргей Вязовіч заваяваў «серабро» прэстыжнага ралі-рэйду. У тым жа годзе ён прыйшоў першы на Turkmen Desert Race. А прыблізна праз год стаў чэмпіёнам Morocco Desert Challenge.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Добрая навіна

СВАЁ — ВЫГАДНЕЙ

Цяпер ільготныя крэдыты можна атрымаць на ўсе айчынныя легкавушкі

Беларусбанк палепшыў умовы крэдытавання на набыццё айчынных аўтамабіляў. З 28 студзеня гэты банк выдае аўтакрэдыт на Atlas, Emgrand 7, Emgrand X7, якія рэалізуюцца афіцыйнымі дылерамі СЗАТ «БелДжы». Тэрмін крэдыту павялічаны з 7 да 10 гадоў з магчымасцю датэрміновага пагашэння. Пра гэта паведамляе прэс-служба банка.

Дарэчы, у кліента цяпер ёсць магчымасць павялічыць суму крэдыту, уключыўшы ў сукупны даход крэдытаатрымальніка даходы паручыцеля. Памер працэнтнай стаўкі за карыстанне крэдытам на працягу льготнага перыяду крэдытавання (18/24/36 месяцаў) складае не менш за 3,9 % гадавых (стаўка рэфінансавання мінус 5,1 працэнтнага пункта). У далейшым працэнтная стаўка ўстанаўліваецца ў памеры стаўкі рэфінансавання, павялічанай на фіксаваную велічыню (стаўка цяпер складае 12,47 % гадавых).

Выбар ільготнага перыяду крэдытавання ажыццяўляецца ў залежнасці ад унесенай сумы ўласных сродкаў на куплю аўто: чым большая сума, тым большы льготны перыяд крэдытавання.

Пры гэтым Беларусбанк гатовы даць крэдыт на поўную цану набытага аўтамабіля. У гэтым выпадку льготны перыяд крэдытавання па зніжанай стаўцы складзе 18 месяцаў. Калі за кошт уласных сродкаў аплачваецца 10 % цаны аўтамабіля, то зніжаная стаўка дзейнічае 2 гады, калі аплаціць самастойна 25 % цаны аўто — 3 гады.

У банку таксама паведамілі, што напярэдадні святкавання 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, а таксама з мэтай падтрымкі інвалідаў і шматдзетных сем'яў банк прапануе з 3 лютага 2020 года асаблівыя ўмовы крэдытавання для ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, інвалідаў I або II групы, бацькоў шматдзетных сем'яў. Памер працэнтнай стаўкі за першы год карыстання крэдытам для гэтых катэгорый крэдытаатрымальнікаў складзе ўсяго 0,01 %.

Сяргей КУРКАЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Кіраўнік урада Славеніі сышоў у адстаўку

У Славеніі ў выніку палітычнага крызісу распалася кіруючая кааліцыя. Прэм'ер-міністр краіны Мар'ян Шарац падаў у адстаўку. Сам ён растлумачыў свой крок няздольнасцю праводзіць намечаныя рэформы з-за рознагалоссяў унутры кааліцыі. У гэтай сувязі Мар'ян Шарац заклікаў правесці датэрміновыя выбары ў Славеніі. Ён узначаліў урад у 2018 годзе. На той момант Шарацу было 40 гадоў і, такім чынам, ён стаў самым маладым прэм'ерам у гісторыі Славеніі. Кіраўнік урада змог заручыцца падтрымкай левацэнтрысцкіх партый, аднак вызначальнай большасці ў парламенце яму так і не ўдалося дамагчыся. Цяпер, паводле канстытуцыі, у Славеніі павінны прайсці датэрміновыя выбары. Як паведаміў спікер парламента краіны, яны могуць быць арганізаваны ўжо ў красавіку.

Ад залеў у Бразіліі загінулі 47 чалавек

Не менш 47 чалавек загінулі з прычыны апоўзняў, выкліканых праліўнымі дажджамі ў штаце Мінас-Жэрайс на паўднёвым усходзе Бразіліі. Паводле звестак, найбольшая колькасць смерцяў прыпадае на сталіцу штата Белу-Арызонце, дзе стыхія забрала жыцці 13 чалавек. Чатыры чалавекі лічацца зніклымі без вестак. Колькасць пацярпелых ацэньваецца ў 65 чалавек. Больш за 18 тысяч мясцовых жыхароў перамешчаныя ў цэнтры часовага размяшчэння, больш за 3,3 тысячы з іх засталіся без прытулку. У сувязі са стыхіяй улады штата ўвялі рэжым надзвычайнага становішча ў 101 муніцыпалітэце штата, зонамі бедства абвешчаны тры гарады.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне Прэзідэнту Бразіліі Жаіру Балсанару.

Кратар Ярабуба ў Аўстраліі аказаўся найстаражытнейшым на Зямлі

Радыеметрычны аналіз мінералаў (манацыту і крышталя), якія захаваліся ў камянях, паказаў, што ўзрост кратара — каля 2,2 мільярда гадоў. Прафесар Крык Кірклэнд з аўстралійскага Універсітэта Керціна, які ўдзельнічаў у даследаванні, расказаў, што пасля ўдару метэарыта крышталі ўтварылі структуры, якія можна чытаць, «як гадавыя кольцы на дрэвах». Ярабуба аказаўся сама меней на 200 мільёнаў гадоў старэйшы, чым найбуйнейшы на планеце Урэдэфорт у ПАР.

Па законе

Юрый КАРАЕЎ:

«Увядзенне бальнай сістэмы — спроба стаць больш гуманнымі і бліжэйшымі да людзей»

Увядзенне бальнай сістэмы ацэнкі работы супрацоўнікаў міліцыі — спроба стаць больш гуманнымі і бліжэйшымі да людзей. Такую думку выказаў журналістам міністр унутраных спраў Юрый КАРАЕЎ пасля калегіі УУС Віцебскага аблвыканкама, перадае БелТА.



Фота БелТА.

Па словах міністра, у ведамстве цяпер мяняюць метады ацэнкі работы праваахоўнікаў. «Нядаўна мною быў падпісаны дакумент аб увядзенні бальнай сістэмы ацэнкі, — адзначыў Юрый Караеў. — Паглядзім, як усё пойдзе. Думаю, бальная сістэма будзе на карысць усім».

Кіраўнік ведамства дадаў, што для паспяховага функцыянавання органаў унутраных спраў супрацоўнікі міліцыі павінны быць прыкладам для грамадзян, не парушаць службовую і асабістую дысцыпліну. «Мы працуем для людзей, а не на нейкую статыстыку. Трэба не ганяцца за дробнымі эканамічнымі злачынствамі, а выяўляць буйную шкоду. Галоўнае, як мы абаранілі грамадзян, ці затрымалі злачынцаў. Асабліва ў рэзанансных справах. Людзі чакаюць, што ва ўсім справядліва разбяруцца і злачынства не застанецца нераскрытае», — адзначыў Юрый Караеў.

Міністр унутраных спраў таксама пракаментаваў работу міжведамаснай экспертнай групы па ўдасканаленні заканадаўства аб адміністрацыйнай адказнасці. «Ад МУС у ёй працуюць і практыкі, і навукоўцы. Нейкія артыкулы могуць дэкрыміналізаваць, некаторыя будуць насіць папераджальна-прафілактычны і дыферэнцыраваны характар», — заўважыў Юрый Караеў.

УУС Віцебскага аблвыканкама падвяло вынікі работы міліцыі рэгіёна за мінулы год. На калегіі ўзнагародзілі супрацоўнікаў міліцыі, уручылі пераходны прыз «Святы Георгій — узнагарода ўпраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама» і службовыя аўтамабілі найлепшым калектывам аддзелаў унутраных спраў. Імі сталі праваахоўнікі Дубровенскага, Сенненскага, Полацкага раёнаў і Наваполацка.

На свае вочы

ФАКУЛЬТЭТ ПАТРЭБНЫХ РЭЧАЎ

Як кажуць, лепш адзін раз убачыць, чым сто разоў пачуць. На факультэце ўнутраных войскаў Ваеннай акадэміі для будучых абітурыентаў зладзілі дзень адчыненых дзвярэй. Тыя, у каго прамільгнула думка паступіць вучыцца менавіта сюды, маглі пагутарыць з прадстаўнікамі камандавання, паназіраць за паказальным выступленнем кіналагічных разлікаў і спецназа, паглядзець, у якіх умовах жывуць курсанты. Па падліках арганізатараў, на мерапрыемства прыйшло больш за паўтысячы гасцей. Сярод іх былі навучэнцы школ, кадэты і салдаты тэрміновай службы. Юнакі і іх бацькі маглі атрымаць адказы на ўсе пытанні, якія датычацца непасрэдна самога паступлення. А яно вельмі моцна кантрастуе з грамадзянскімі спецыяльнасцямі. Завіталі туды і карэспандэнты «Звязды».

Спачатку трэба сказаць некалькі слоў пра само месца дзеяння. На гэтым тыдні факультэту ўнутраных войскаў Ваеннай акадэміі споўнілася 27 гадоў. За час яго існавання там падрыхтавалі больш за паўтары тысячы афіцэраў. Шэсцьдзясят з іх скончылі вучобу з адзнакай і залатым медалём, амаль сто атрымалі дыплом з адзнакай. Дзесяць выпускнікоў сталі стыпендыятамі спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі.

— Скажу адразу: вучыцца ў нас няпроста, — адзначыў **начальнік факультэта палкоўнік Уладзімір ГАЎДУР.** — Але навучальны працэс скіраваны на тое, каб дапамагчы маладым людзям развіцца па ўсіх магчымых кірунках. Нашых выпускнікоў вельмі шануюць у падраздзяленнях спецыяльнага прызначэння. А яшчэ ў нас юнакі праходзяць сапраўдную школу жыцця, якая дапамагае ім пасля ў дарослым жыцці.

На пачатку падрыхтоўкі будучага афіцэра шмат увагі ўдзяляецца сустрэчам і гутаркам з бацькамі курсантаў. Гэта трэба для таго, каб як мага глыбей разабрацца ў характары і валявых якасцях першакурсніка.

— Залічаныя першакурснікі ў жніўні праходзяць праз абавязковы збор. І вось бывае так, што абітурыент паспяхова здаў фізічныя нарматывы, цэнтралізаванае тэсціраванне, прайшоў праз псіхалагічнае сураз-моўе, а на зборы ад яго падчас пераадольвання паласы перашкод даводзіцца чуць: «Я не хачу паўзці», «Мне не падабаецца страляць», «Тут вельмі брудна» — ці нешта ў падобным стылі. Але нашы курсанты — гэта не толькі будучыя юрысты, але і вайскоўцы. Так бы мовіць, два ў адным. І рабочая абстаноўка, у якой яны могуць апынуцца падчас выканання сапраўднага задання, патрабуе менавіта такой падрыхтоўкі, якая не заўжды звязана са знаходжаннем у навучальнай аўдыторыі. Таму калі мы бачым, што юнак гэта не ўсведамляе, на жаль, даводзіцца з ім развітвацца.

Колькі ж чалавек паступае на факультэт унутраных войскаў? Летась праз канчатковы прафесійны адбор прайшлі 78 абітурыентаў. Але форму курсанта гэтага факультэта надзелі 60 першакурснікаў. Прычым пяцёра з іх былі да таго ваеннаслужачымі.

— Шмат хто з абітурыентаў «спатыкаецца» на нашых псіхалагічных тэстах, — згадвае Уладзімір Гаўдур. — Ды і ўзровень фізічнай падрыхтоўкі часта пакідае жадаць лепшага. Цяпер падлеткі вельмі шмат часу праводзяць сам-насам са смартфонамі і камп'ютарамі, вядуць сядзячы лад жыцця.

Па заканчэнні вучобы выпускнікі размяркоўваюцца на першасныя пасады камандзіраў узводаў у падраздзяленнях унутраных войскаў. А вось дзяўчат тут не сустрэнеш. Адпаведны эксперымент праводзіўся каля дзесяці гадоў таму, але не скончыўся паспяхова.

Структура факультэта налічвае тры вучэбныя кафедры — тактычнай падрыхтоўкі ўнутраных войскаў, інжынерна-тэхнічных сродкаў аховы і юрыдычную. Што датычыцца іншых прадметаў, у ліку якіх, напрыклад, агульнавайсковая тактыка і агнявая падрыхтоўка, — то тут курсанты вучацца на кафедрах непасрэдна Ваеннай акадэміі.

— Разам з тым нельга сказаць, што мы «замкнуты» толькі ў межах адной навучальнай установы. Кадры для ўнутраных войскаў рыхтуюць не толькі на нашым факультэце, але і ў грамадзянскіх навучальных установах, сярод якіх БДУ, БНТУ, ГрДУ імя Янкі Купалы. Акрамя таго, па дамоўленасцях у межах АДКБ мы накіроўваем некалькі курсантаў для навучання ў вышэйшыя ваенныя навучальныя ўстановы Расіі. Гэта Пермскі і Саратаўскі ваенныя інстытуты войск нацыянальнай гвардыі.

Сімвалам унутраных войскаў з'яўляецца легендарны крапавы берэт. Здабыць яго — мара любога спецназаўца. Лёгкіх дзён падчас падрыхтоўкі ў тых, хто служыць у элітным падраздзяленні, не бывае. Фізічныя нагрузкі толькі ўзрастаюць. На першы погляд яны могуць здацца амаль нераадольнымі, але гэта не так. Увесь сакрэт — у сістэме навучання і выхавання. Яна грунтуецца на ўзаемадапамозе і разлічана на калектыўнае пераадоленне цяжкасцяў.

Жыхар Мінска Андрэй прыйшоў паназіраць за спецназаўцамі разам з дзвума дзецьмі.

— Я тут не ўпершыню. Вельмі падабаецца відовішча. Асабліва ўражваюць выступленні спецназаўцаў, ды і малым маім цікава паназіраць. Усё-такі гэтыя падзеі разгортваюцца не на тэлевізійным экране, а за некалькі метраў ад нас.

— Я вучуся ў дзявятым класе, але задумваюся паступаць сюды, — кажа **вучань мінскай сярэдняй школы № 168 Яўген НОВІКАЎ.** — Мне гэта цікава, хацеў бы паспрабаваць. Падабаецца сама форма, фізічныя практыкаванні не палохаюць. Зачаравала тое, як праходзіў рукапашны бой...

Непадалёк ад плаца разгарнулася выстаўка тэхнікі, стралковага і сапёрна-тэхнічнага ўзбраення. Апошняе асабліва цікава ў свеце таго, што ўнутраныя войскі займаюцца размініраваннем у гарадах, — на жаль, рэха вайны гучыць яшчэ і дагэтуль.

— У нас абсталяванне вельмі магутнае, — кажа **начальнік выбуховатэхнічнага цэнтра ўнутраных войскаў падпалкоўнік Ігар ТАМКО.** — Закупляем самыя апошнія ўзоры. Усе прыборы скіраваны на пошук выбуховых прылад, догляд падазроных і бесгаспадарчых рэчаў... Ёсць у нас і спецыяльны робат. Зроблены ён у Беларусі. Ажыццяўляе разведку падазроных прадметаў. Пры пэўнай вазе можа іх нават адвезці на бяспечную адлегласць, затым транспартаваць усё неабходнае абсталяванне. Здольны працаваць удзень і ўначы. Ён абсталяваны відэакамерамі, дзякуючы якім робатам можна кіраваць на адлегласці.

Паказалі журналістам і навучальны корпус, і спартыўны комплекс. Якраз у гэты час сярод першакурснікаў ішлі заняткі па абяскшкоджванні праціўніка, які нападае з нажом.

Трэба сказаць колькі слоў пра размяшчэнне. Першыя два курсы жывуць у казарме. Навучэнцы на іх прыроўнены да салдат тэрміновай службы. А вось для тых, хто дайшоў да трэцяга курса, ужо прадугледжаны асобныя пакоі на 4—6 чалавек. І тут ужо ўсё па-дамашняму — вісяць гітара, расцяжка з сімволікай улюбёнага футбольнага клуба і нават ёсць стэрэасістэма. Амаль як дома!

Час падачы дакументаў на факультэт унутраных войскаў для абітурыентаў з ліку грамадзянскай моладзі скончыцца даволі хутка — 1 красавіка. Каб гэта зрабіць, трэба прыйсці ў ваенны камісарыят па месцы жыхарства. Праверка стану здароўя, фізічнай падрыхтоўкі і прафесійна-псіхалагічны адбор прызначана на тэрмін да 31 мая.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Профі

«Прыемна, калі падапечныя вырастаюць, заводзяць сем'і і не вяртаюцца да ранейшага»

Адзін з найлепшых у краіне інспектараў па справах непаўналетніх расказвае пра службу і няпростых падлеткаў

Вячаслаў САЙКО ўпэўнены, што да любога цяжкага падлетка можна знайсці падыход, заахвоціць уласным прыкладам да карысных заняткаў (напрыклад, да спорту) і накіраваць яго на шлях выпраўлення. І такіх падлеткаў, якія замест колішняй п'янай кампаніі выбіраюць велапрагулку ў кампаніі інспектара, шмат. Нездарма падпалкоўнік міліцыі Сайко лічыцца адным з найлепшых інспектараў па справах непаўналетніх у краіне.
На рэспубліканскім аглядзе-конкурсе прафмайстэрства ён двойчы станавіўся лепшым (у 2015 і 2016 гадах). Як знайсці агульную мову з цяжкімі падлеткамі і як звычайна далей складваецца іх лёс, чаму найлепшая зброя — гэта слова, і што інспектар рэкамендуе бацькам няпростых дзяцей, — у нашым матэрыяле.

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Пра выбар прафесіі і свой участак

— Вячаслаў Міхайлавіч, раскажыце, чаму вы прыйшлі ў міліцыю?

— Я мяркую, гэта лёс. Цікава, што калі вызначаўся з выбарам прафесіі пасля школы, не бачыў сябе ні ваенным, ні супрацоўнікам міліцыі. Паступіў на геаграфічны факультэт БДУ. А на чацвёртым курсе пазнаёміўся з хлопцамі — курсантамі Акадэміі МУС, мы пасябравалі. Пасля заканчэння БДУ мне прапанавалі пайсці ў органы ўнутраных спраў. Абдумаў і пагадзіўся. Так з чэрвеня 1994 года і працую ў Савецкім РУУС Мінска.

— Магчыма, памятаеце свой першы рабочы дзень?

— Канешне! Калі заступіў на службу, якраз пачаліся выпускныя вечары. Мяне, як навічка, накіравалі ў дзяжурную частку, дзе я мог назіраць, як старэйшыя калегі праводзяць разбіральніцтвы з грамадзянамі, у тым ліку і з падлеткамі, якія затрымліваліся за розныя правапарушэнні. У такой абстаноўцы прайшоў першы рабочы дзень. Мая служба пачыналася з інспекцыі па справах непаўналетніх, там я і працую дагэтуль — ужо 26-ы год. Мяняліся толькі ўчасткі.

— Раскажыце пра ваш цяперашні.

— Ён супадае з тэрыторыяй, якую абслугоўвае грамадскі пункт аховы правапарадку № 94. Гэта спальны мікрараён у Зялёным Лузе. Там знаходзяцца дзве навучальныя ўстановы і іх інтэрнаты. Гэта мінскі дзяржаўны прафесійны ліцэй № 12, дзе рыхтуюць будаўнікоў, другая навучальная ўстанова — гандлёвы каледж. І там, і там ёсць выхаванцы, якія патрабуюць нашай увагі. Тут трэба ўлічваць, што гэтыя дзеці адарваліся ад сям'і, сярод іх заўсёды ёсць тыя, хто дазваляе сабе вольнасці. Без пільнага кантролю дарослых гэта падхопліваюць астатнія. Таму, як правіла, у пачатку навучальнага года збіраем іх, тлумачым асаблівасці заканадаўства, папярэджваем, прыводзім прыклады, каб дзеці арыентаваліся. Далей на працягу года стараемся прыцягваць іх да нашых сумесных мерапрыемстваў, асабліва тых, хто патрабуе асаблівай увагі.

— Сярод цяжкіх падлеткаў шмат дзяўчат?

— На ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх Савецкага РУУС 112 дзяцей і падлеткаў, больш за чвэрць з іх — дзяўчаты.

Пра асаблівасці кантактавання ў нефармальнай абстаноўцы

— Якія правапарушэнні здзяйсняюць непаўналетнія?

— Распіваюць алкагольныя напоі, узрываюць піратэхнічныя вырабы, удзельнічаюць у канфліктных сітуацыях, якія часам парушаюць закон. Алкаголь — правакатар многіх злачынстваў: хуліганстваў, гвалтоўных дзеянняў і іншых. Апошнім часам стала больш крадзяжоў маёмасці з выкарыстаннем камп'ютарнай тэхнікі і даных банкаўскіх картак.

— Ці даводзілася сутыкацца з забойствамі?

— Некалькі гадоў таму ў Маскоўскім раёне быў знойдзены труп 9-гадовай дзяўчынкі, нейкі час не маглі ўстанавіць яе асобу. Падчас аператыўных дзеянняў высветлілася, што на маім участку не прыйшла ў школу дзяўчынка, падобная па прыкметах. Сталі разбірацца, устанавілі, што забойства здзейсніла маці — у яе была схаваная форма шызафрэніі. Ніхто, на жаль, не ведаў раней, што ў сям'і такая сітуацыя, бо прафілактычныя меры маглі б дапамагчы. Гэты выпадак стаў непрыемным выключэннем у маёй службовай дзейнасці.

— Работа з цяжкімі падлеткамі больш складаная, чым з дарослымі? Як знаходзіце з імі агульную мову?

— Падлеткі хутчэй паддаюцца ўплыву. Гэта трэба ўлічваць і паспець перахапіць ініцыятыву ў свае рукі, заахвоціць асабістым прыкладам. Я займаюся спортам і імкнуся зацікавіць іх. Яшчэ ў 1991 годзе абараніў званне майстра спорту па гіравым спорце, двойчы быў чэмпіёнам краіны, выйграваў кубак у катэгорыі да 80 кг. У міліцыі давялося праяўляць сябе ў іншых відах — бегу, лыжах, стральбе, плаванні. Падлеткам манатонныя размовы ў кабінеце, як правіла, мала цікавыя. Я імкнуся працаваць з імі ў нефармальнай абстаноўцы: зайсці ў госці, сустрэць на вуліцы, запрасіць на мерапрыемства, дзе прасцей размаўляць. Вось нядаўна гулялі ў валейбол: арганізавалі змешаныя каманды з інспектараў і падлеткаў. Многія былі здзіўленыя, што мы праводзім такія спаборніцтвы.

Вясной мы традыцыйна арганізуем велапрабег: збіраемся непадалёк ад Цнянскага вадасховішча, часам запрашаем святара, які дае свой наказ, далучаюцца супрацоўнікі ДАІ. Заязджаем у Цэнтр выратавальна-вадалазнай службы. Гэта закрытая тэрыторыя, туды проста так не трапіць, але для нас праводзяць экскурсіі. У дзяцей вялікая цікавасць да гэтага аб'екта, там праяўляецца больш за ўсё эмоцый. Заканчваем прагулку на выратавальнай станцыі Цнянскага вадасховішча. Арганізуем мы і іншыя экскурсіі. Напрыклад, у месцы зняволення са складанымі дзецьмі, каб яны на свае вочы паглядзелі, чым могуць скончыцца іх паводзіны.

На мой погляд, у любога падлетка можна выклікаць прыхільнасць, іншая справа, што не адразу. З тымі, хто прайшоў пэўную «школу» дэвіянтных паводзін, канешне, няпроста.

— Былі выпадкі, калі патрабавалася выкарыстоўваць табельную зброю?

— На шчасце, не даводзілася. Гэта ўжо надзвычайная сітуацыя. Любы канфлікт можа стаць некантраляваным, калі не ўтрымаць яго ад напружання. Я заўсёды імкнуся знайсці патрэбныя словы ці нават пажартаваць — у залежнасці ад таго, які перад табой чалавек. І гэта дзейнічае, нават калі падлеткаў цэлы натоўп і настроены яны не вельмі міралюбна. На маім участку знаходзіцца яшчэ і частка тэрыторыі Цнянскага вадасховішча. Гэта зона актыўнага адпачынку, асабліва ў цёплы перыяд. Там таксама шмат здарэнняў — ад распіцця спіртнога да канфліктных сітуацый. Вось там нярэдка даводзіцца ўціхамірваць кампаніі, у тым ліку і падлеткавыя.

Пра неўладкаваныя сем'і і пажаданні бацькам

— Вам часта даводзіцца сутыкацца з неўладкаванымі сем'ямі. Не ведаю, наколькі дарэчы ў рабоце інспектара па справах непаўналетніх такое пачуццё, як шкадаванне, але ці даводзілася яго адчуваць у дачыненні да вашых выхаванцаў?

— Гэта хутчэй спачуванне і разуменне. Але ж такія пачуцці працуюць і ў адваротны бок. Тыя ж сіроты, калі іх спрабуюць улагодзіць, патураць ім, пачынаюць гэтым карыстацца, у іх выпрацоўваецца пэўнае ўтрыманства, яны выхоўваюцца не прыстасаванымі да жыцця. Лёс потым жорстка можа з імі абысціся, калі яны атрымаюць дыпломы і выпусцяцца з ліцэя ці каледжа. Тут міліцыянеру трэба паводзіць сябе як бацьку: дзесьці строга і патрабавальна, а дзесьці і мякка.

— Як звычайна складваецца лёс у цяжкіх падлеткаў?

— Каля 95 % тых, хто аднойчы трапляе ў поле зроку інспекцыі па справах непаўналетніх, пасля больш ніколі не сутыкаецца з намі. І спадзяюся, што гэты вопыт карысны для іх. Ёсць падлеткі, з якімі даводзіцца часам ужываць метады ізаляцыі. Іх накіроўваюць у Магілёўскую спецыяльную школу закрытага тыпу для хлопцаў і аналагічную для дзяўчынак — у Петрыкаве. Калі падлеткі здзяйсняюць пэўныя правапарушэнні, згодна з заканадаўствам адпраўляюцца ў закрытыя ўстановы. Да гэтага прыводзяць чатыры правапарушэнні на працягу года. Прычым пасля кожнага з іх праводзіцца карпатлівая работа. Падключаюцца ўсе суб'екты прафілактыкі: і школа, і ўрач-нарколаг, і псіхолагі. Прыцягваем да справы гурткі, секцыі, каб выцягнуць падлетка з неспрыяльнага асяроддзя. На жаль, не заўсёды атрымліваецца — дватры чалавекі ў год даводзіцца накіроўваць у спецшколу. Але трэба разумець, што гэта не турма, а навучальная ўстанова. І такі захад неабходны, каб зберагчы і іншых, і самога падлетка. Бо часам нават цяжка прадказаць, як у яго складзецца чарговы вечар.

— За што вам звычайна кажуць дзякуй падлеткі і іх бацькі?

— Самы вялікі дзякуй — гэта калі, пазнаёміўшыся з чарговым падапечным і растлумачыўшы яму ўсё, бачыш, што твае прапановы знаходзяць водгук. І калі ён не здзяйсняе правапарушэнняў, гэта найлепшы падарунак. Бо кожнае злачынства непаўналетняга — гэта надзвычайнае здарэнне для нас. Радуе, калі і бацькі, і падлеткі з разуменнем ставяцца да нашай дзейнасці. Я жыву на тым участку, на якім і працую. Часта сустракаеш падапечных, бачыш, як складваецца іх жыццё. Прыемна, калі яны вырастаюць, заводзяць сем'і і не вяртаюцца да ранейшага. У пераважнай большасці іх жыццё ўсё ж наладжваецца.

— Што б вы пажадалі бацькам цяжкіх падлеткаў?

— Часам яны няправільна ацэньваюць нашу дзейнасць: нібыта мы ламаем лёс дзіцяці, псуём яго рэпутацыю. Калі дзіця трапляе ў складаную сітуацыю, не варта яго абяляць, а нас усімі сіламі ачарняць. Варта прыслухоўвацца і да нашых меркаванняў, і да педагогаў, псіхолагаў, старацца выконваць усе рэкамендацыі. Часам бацькі вельмі агрэсіўна рэагуюць, маўляў, не ўмешвайцеся, мы самі справімся. А потым атрымліваецца, што час упушчаны, бацькі ўсведамляюць, што не спраўляюцца, просяць дапамогі. Але калі дзіця ўжо набралася негатыву, абзавялося моцнымі сувязямі ў адпаведнай кампаніі, выцягнуць яго з гэтага асяроддзя нашмат складаней.

Ёсць хлопцы, якія выпадкова трапілі пад нашу ўвагу, напрыклад, пасядзелі ў кампаніі на Цнянскім вадасховішчы, дзе іх затрымалі за распіццё спіртнога. Але не варта забываць, што побач вада, куды яны і лезуць потым. Таму нічога страшнага ў тым, што мы правядзём прафілактычную работу, няма. Зразумела, непрыемна — і ў школе не пахваляць, і бацькі незадаволеныя, але мы, магчыма, зберажом дзяцей ад больш сур'ёзных дрэнных учынкаў і наступстваў.

Алена КРАВЕЦ.

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «СМТ № 8», г. Минск, ул. Пионерская, 37

Предмет аукциона

Лот № 1

Месторасположение**: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Добрушская, 91А и 91Д**

Производственная база в составе: **склад РМХ-20** (350/С-174808, 193,5 кв. м), **здание материального склада № 2** (350/С-56797, 478,6 кв. м), **здание административно-бытовое (**350/С-56799, 550,5 кв. м), **гараж** (350/С-56788, 675 кв. м), **склад по обогреву инертных материалов** (350/С-56798, 29,6 кв. м), **склад масел** (350/С-56822, 23,5 кв. м), **здание материального склада № 1** (350/С-56796, 1072,5 кв. м), **склад цемента** (350/С-56819, 33 кв. м), **проходная** (350/С-56823, 14,8 кв. м), **компрессорная** (350/С-56820, 62,6 кв. м), **котельная** (350/С-56800, 110 кв. м), **ограждение и бетонная площадка производст-венной базы** (350/С-204615, составные части: ограждения – ж/б – 468,1 кв. м, 316,0 кв. м, 1214,5 кв. м, из металлической сетки – 11,5 кв. м, деревянное – 17,1 кв. м, металлическое – 4,8 кв. м, кирпичное – 4,3 кв. м; ворота, калитка, площадка бетон., покрытия).

Сведения о земельном участке: предоставлены на праве постоянного пользования пл. **4,4874** га для эксплуатации и обслуживания администрат. и производственно-склад. помещений производ. базы и пл. **0,5576** га для эксплуатации и обслуживания зданий специализир. складов, торговых баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ. Обременения прав на зем. уч. 0,5576 га – охранные зоны линий связи и радиофикации, электрич. сетей, сетей и сооружений водоснабжения и канализации

Подать организатору торгов в срок с даты опубликования до 17.00 27.02.2020 заявление на участие в торгах с приложением документов в соответствии с Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в редакции постановления Совмина от 12.07.2013 № 607), заключить с организатором торгов договор о задатке, заключить с организатором торгов соглашение об оплате вознаграждения организатора торгов. Место приема заявлений – Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41. Телефон для ознакомления и осмотра лота +375 29 684 71 76, Яскевич Дмитрий Васильевич (до 17.00 в рабочее время).
В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.
Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.
Шаг торгов 5 % от начальной цены лота. Задаток за участие в торгах 10 % от начальной цены лота.
Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за 3 (три) дня до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.
Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.
Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае если:
- заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;
- на торги явился один из участников либо ни один из участников не явился.
В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить Организатору торгов установленное вознаграждение согласно заключенному соглашению в течение 5 дней со дня их проведения.
Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 5 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.
Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 10 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен продавцом.

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Унитарного предприятия «Строительно-монтажное управление «Подъем» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:
– открытый склад с мостовым краном, инв. № 100/U-91645 общей площадью 1160 кв. м, расположенный по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Вычулки, 129/7;
– трансформаторная подстанция с инв. № 100/U-91646 общей площадью 57 кв. м, расположенная по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Вычулки, 129/9;
– административно-бытовое здание с инв. № 100/U-91643 общей площадью 653,2 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Вычулки, 129 (далее – Объекты).
Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 121284001601000822 (право постоянного пользования) площадью 1,1258 га по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Вычулки, 129 *(земельный участок имеет ограничения прав в использовании: водоохранная зона реки Мухавец, площадь – 0,1258 га, охранная зона электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт, площадь – 0,1982 га)*.
Начальная цена с НДС (20 %) – 787 881,60 бел. руб. *(цена снижена на 12 %)*. **Задаток 10 % от начальной цены (78 788,00 бел. руб.).**
Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».
Шаг аукциона – 5 процентов.
Порядок проведения аукциона регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
Лицо, желающее участвовать в торгах, обязано подать организатору торгов в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах, документ о внесении суммы задатка на р/с, указанный в извещении, с отметкой банка, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: юр. лицом РБ – копии устава со штампом о проведении гос. регистрации, свидетельства о гос. регистрации и их подлинники для заверения копий, доверенность представителю юр. лица или документ, подтверждающий полномочия руководителя юр. лица; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юр. лица или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; индивидуальным предпринимателем РБ – копия свидетельства о гос. регистрации и подлинник для заверения копии; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного физ. лица, индивидуального предпринимателя – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в торгах физ. лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физ. лица, индивидуального предпринимателя, юр. лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов соглашение.
В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника предмет торгов продается ему по начальной цене, увеличенной на 5 %.
В день проведения торгов победитель торгов (единственный участник, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) подписывает протокол о результатах торгов.
Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (единственный участник, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5%) (покупатель). Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.** Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» 28.12.2019.
Аукцион состоится **10.02.2020** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **07.02.2020** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

УНП 192522108

БПС-СБЕРБАНК

Уважаемые владельцы (физические лица)

текущих (расчетных) счетов, в том числе с использованием банковской платежной карточки, благотворительных счетов (далее – Счет), открытых в ОАО «БПС-Сбербанк» (далее – Банк), по которым отсутствуют операции в течение одного года (кроме зачисления процентов), не включая срока наложения ареста либо приостановления операций по Счету (далее – Неактивные счета)!

Сообщаем вам, что в соответствии со ст. 206 Банковского кодекса Республики Беларусь банк вправе прекратить обязательства по договору об открытии Счета при соблюдении и наступлении условий, предусмотренных указанной статьей, а также договором об открытии Счета.
Настоящим уведомляем вас об отсутствии по вашему Счету операций в течение одного года (кроме зачисления процентов), не включая срока наложения ареста либо приостановления операций по Счету, а также предупреждаем о прекращении обязательств Банка по соответствующим договорам по истечении шести месяцев, начиная с даты настоящего уведомления. Обязательства по договорам текущих (расчетных) счетов с использованием банковской платежной карточки будут прекращены Банком по истечении шести месяцев со дня прекращения срока действия соответствующей банковской платежной карточки.
Если в течение 6 месяцев, начиная с даты настоящего уведомления, вы не возобновите движение денежных средств по неактивному счету, Банк прекратит обязательства по соответствующему договору и закроет его, перечислив неиспользованный остаток денежных средств на отдельный счет без начисления процентов, и по истечении срока, установленного законодательством Республики Беларусь, зачислит его в доход Банка.
При этом Банк обязуется возвратить по требованию владельца неактивного счета остаток денежных средств, находившихся на данном счете на момент его закрытия.
Операции по неактивному счету можно совершить в любом подразделении Банка.
Информацию о режиме работы подразделений можно получить по телефону: 148 – в стационарной и мобильных сетях; (+375 25/ 29/ 44) 5-148-148 – для международных звонков.

УНП 100219673

ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении первых повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «Комплайнинвест» (УНП 192936454, г. Минск, пр-т Партизанский, д. 23А, пом. 1Н, комната 1), находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)

Дата и время проведения торгов: **14 февраля 2020 года**. Начало – 12.00. Заявки принимаются с 29 января 2020 года по 13 февраля 2020 года.
Место проведения торгов: Минск, пр-т Победителей, 31–1, комната переговоров ОАО «Гостиница Планета».
Организатор торгов: ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.
Продавец: **ООО «Комплайнинвест» (УНП 192936454)** в лице управляющего частного унитарного предприятия «Правовая компания «БелПрофКонсалт», тел. 8 (033) 653-38-17

№ лота	Предмет торгов	Начальная цена, руб.	Шаг торгов	Задаток
1	Капитальное строение с инвентарным номером 233/С-1648 (назначение – здание специализированное финансового назначения, наименование – здание банка), 1994 года постройки, расположенное по адресу: Витебская обл., Чашникский р-н, г. Новолукомль, ул. Энергетиков, 13, площадь – 918,7 кв. м. Сведение о земельном участке: кадастровый номер участка – 225151000002000110 в праве постоянного пользования, площадь земельного участка – 0,2625 га, назначение – земельный участок для использования под административное здание	507 502, 80 руб. без учета НДС (в соответствии с подп. 2.30.2 п. 2 ст. 115 НК РБ)	5 %	5 %

Для участия в торгах необходимо:
в срок до 17.00 13 февраля 2020 года перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY98PJCB30123042861000000933 в ОАО «Приорбанк», код PJCBBY2X, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация».
Подать организатору торгов в срок с даты опубликования до 17.00 13.02.2020 заявление на участие в торгах с приложением документов, перечисленных в ст. 127 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».
В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.
Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.
Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.
Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.
Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае если:
- заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;
- на торги явился один из участников либо ни один из участников не явился.
В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить Организатору торгов установленное вознаграждение в размере 3 % от цены продажи предмета торгов в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 15 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.
Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов.

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 215 (29082) за 13.11.2019.

Культура памяці

«А ДЗЕ БЫЎ ЧАЛАВЕК?»

На адмысловым форуме ў цэнтры імя Рау пагаварылі пра Халакост і талерантнасць

Па ўсёй краіне 27 студзеня — у семдзесят пятую гадавіну вызвалення канцэнтрацыйнага лагера Аўшвіц — запальвалі свечкі ў памяць аб загінулых. Адным з месцаў для рытуалу стаў Мінскі міжнародны адукацыйны цэнтр імя Ёханэса Рау, дзе Міжнародны дзень памяці ахвяр Халакосту адзначылі адмысловым форумам «Праблемы талерантнасці ў сучасных грамадствах» з удзелам дыпламатаў, прадстаўнікоў яўрэйскіх грамадскіх аб'яднанняў і былых вязняў Мінскага гета. Кароткая цырымонія запальвання свечак, у якой удзельнічалі паслы некалькіх дзяржаў, прадстаўнікі ААН і Міністэрства замежных спраў Беларусі, суправаджалася размовамі пра ксенафобію і ў прыватнасці пра антысемітызм, нецярпімасць і мову варожасці.

«Пражыць Мінскае гета ўдалося нямногім людзям, — выступіў яго былы вязень Якаў Краўчынскі. — Яно было часткай бесчалавечанага жадання знішчыць цэлы народ, дзе загінула больш за восемдзесят тысяч чалавек. Мы заўсёды кажам: пагром. У Мінскім гета пагрому не было: колькі фашысцкае кіраўніцтва ні намагалася зрабіць так, каб жыхары горада ўварваліся ў гета і ўчынілі разню, у яго гэта не атрымалася. Але мелі месца добра арганізаваныя акцыі з удзелам нямецкага войска, паліцыі і расстрэльных камандаў. Апроч як падчас гэтых акцый, людзі паміралі кожны божы дзень: не зняў шапку за пятнаццаць крокаў ад немца — куля; падышоў да дрота, нешта абмяняць ці проста так, — куля; здалося, што ў цябе брудная альбо дрэнна прышытая лата, — таксама куля. Гэта працягвалася кожны дзень. Апроч таго, людзей да апошняга эксплуатавалі: прымушалі працаваць на прадпрыемствах, чысціць вуліцы — знаходзілі розныя спосабы, каб людзі паміралі ад змардавання і непасільнай працы. Маё адзінае пажаданне — каб такое больш не паўтарылася, гэта вельмі цяжка ўспамінаць».

Тое, што Міжнародны дзень памяці ахвяр Халакосту гэтым разам быў адзначаны ў тым ліку Міністэрствам замежных спраў Беларусі, — па словах рабіна Мардэхая Райхінштэйна, упершыню на такім высокім узроўні, — сведчыць, што з кожным годам на гістарычную падзею звяртаецца ўсё больш увагі. На наша пытанне, ці ёсць у дыскусіі пра Халакост бакі, да якіх беларускае грамадства пакуль не гатова, спадар Райхінштэйн, наадварот, адзначыў нашу «суперталерантнасць»: «Пра Халакост выходзіць усё больш і больш інфармацыі, і, я думаю, Беларусь лепш за ўсіх гатова яе ўспрымаць. Гэта дзіўная краіна, бо, напэўна, адзіная, на тэрыторыі якой пры вялікай яўрэйскай абшчыне не было колькі-небудзь масавага здрадніцтва і для задач знішчэння не хапала «сваіх» супрацоўнікаў, таму іх завозілі з іншых тэрыторый. Да таго ж, на мой погляд, антысемітызм у цэлым на постсавецкай прасторы змяншаецца».

Хоць лейтматывам такіх дзён — і гэты не стаў выключэннем — традыцыйна становяцца словы пра важнасць захавання памяці аб загінулых, каб не паўтарыць мінулае ў будучыні, выступоўцы форуму адзначылі трывожныя сведчанні таго, што ў сучасным грамадстве нецярпімасць па нацыянальнай прыкмеце ўсё яшчэ сябе праяўляе. Рабін Рыгор Абрамовіч успомніў абліты чорнай фарбай помнік ахвярам Халакосту ў Магілёве, разбітае шкло сінагогі ў Бабруйску, графіці ў выглядзе свастыкі на сценах Ізраільскага культурнага цэнтра ў Мінску.

«У Мінскім гета пагрому не было: колькі фашысцкае кіраўніцтва ні намагалася зрабіць так, каб жыхары горада ўварваліся ў гета і ўчынілі разню, у яго гэта не атрымалася».

Адраджэнне праблемы нецярпімасці пацвердзіў і пасол Германіі ў Беларусі Манфрэд Хутэрэр: «Мы — немцы — адчуваем вялікі сорам за варварскія злачынствы, якія выходзяць за межы разумення, учыненыя немцамі на гэтай тэрыторыі. Памятаць пра гэтыя злачынствы, назваць вінаватых і захаваць дастойную памяць аб ахвярах — неаддзельная ад нашай краіны адказнасць, якая не падлягае абмеркаванню. Усведамленне гэтай адказнасці з'яўляецца часткай нашай нацыянальнай ідэнтычнасці, нашага разумення сябе як адукаванага грамадства і прававой дзяржавы. На жаль, мы жывём у час небяспекі таго, што дэманы мінулага, якія лічыліся памерлымі, прачнуцца. Мала хто з нас мог уявіць, што ў Германіі зноў пачнуць цкаваць яўрэяў, абражаць на вуліцы людзей з кіпай на галаве, дражніць яўрэйскіх дзяцей у школах. Але гэта адбываецца ў маёй краіне, хоць я не мог нават падумаць, што такое яшчэ магчыма. Нядаўняй кульмінацыяй тэндэнцыі стала страшнае нападзенне на яўрэйскую абшчыну ў Гале».

Спадар Хутэрэр лічыць, што нарастаючы антысемітызм у Германіі, а таксама ў іншых частках Еўропы, нясе небяспеку дэмакратыі і плюралістычнаму грамадству і важна ўлічваць, што антысемітызм накіраваны не толькі супраць яўрэяў, але таксама выяўляе глыбока антыдэмакратычны светапогляд.

Сярод выступоўцаў у Цэнтры імя Рау былі прадстаўнік Саюза беларускіх яўрэйскіх грамадскіх аб'яднанняў і абшчын Барыс Герстэн, пастаянны каардынатар ААН у Беларусі Іаана Казана-Вішнявецкі і прадстаўнік Галоўнага ўпраўлення шматбаковай дыпламатыі Міністэрства замежных спраў Аляксандр Апімах. Удзельнікі форуму паспелі абмеркаваць ролю адукацыі ў зніжэнні антысеміцкіх настрояў, шляхі барацьбы з ксенафобіяй праз сферу культуры і СМІ, прадухіленне злачынстваў на глебе нянавісці, а пытанне Халакоста абмеркаваць як з гістарычнага ракурсу, так і з філасофскага.

«Беларусь — дзіўная краіна, бо, напэўна, адзіная, на тэрыторыі якой пры вялікай яўрэйскай абшчыне не было колькі-небудзь масавага здрадніцтва і для задач знішчэння не хапала «сваіх» супрацоўнікаў, таму іх завозілі з іншых тэрыторый».

Фота БелТА.

«Людзі любяць пытацца, дзе быў Бог падчас катастрофы і як ён такое дапусціў, але трэба таксама задаць пытанне, а дзе ў гэты час быў чалавек і агульначалавечыя каштоўнасці? — кажа Мардэхай Райхінштэйн. — Нам і сёння трэба думаць пра прыроду чалавека, бо ад таго, што мы сталі больш цывілізаваныя, што развілася тэхніка, што ў кожным доме ёсць душ, прырода чалавека не змянілася. На мой погляд, гэта глабальная рэч, і калі мы хочам выкараніць нейкія недахопы сучаснасці, трэба ў першую чаргу думаць пра адносіны чалавека да іншых».

Мерапрыемствы і выступленні, прысвечаныя Міжнароднаму дню памяці ахвяр Халакосту, 27 студзеня праходзілі па ўсім свеце. Галоўнае з іх — урачыстая цырымонія ў гонар вызвалення Аўшвіца — адбылося на месцы самой групы канцэнтрацыйных лагераў, куды прыехала каля двухсот былых вязняў і больш за пяцьдзясят прадстаўнікоў краін свету.

Вольга МІЦКЕВІЧ.

Спытайце пра радзіннае

Што азначае перавернуты кілішак на памінках?

Ліст з Мінска ад Вольгі К.: «Так адбылося, што адразу пасля сустрэчы Новага года, менавіта 2 студзеня, давялося хаваць стрыечную бабулю, якая жыла ў вёсцы недалёка ад Мінска. Памінкі зрабілі ў хаце, а не ў сталоўцы. Прыйшлі яе суседзі, сябры, знаёмыя.
Адзін з самых старых дзядоў строга сачыў, каб людзі выпілі па тры чаркі, за кожным разам прапаноўваў камусьці расказаць пра бабулю. І калі трэцюю чарку выпілі, ён перакуліў сваю чарку дагары, устаў, перахрысціўся і пайшоў да дзвярэй. Вясковыя людзі зрабілі таксама, а мы, гарадскія, здзіўлена сачылі за гэтым. Растлумачце, чаму так сябе паводзіў гэты стары чалавек».

У традыцыйнай культуры беларусаў існаваў і да сённяшняга часу захаваўся цэлы шэраг дзеянняў, звязаных з перакульваннем або пераварочваннем прадметаў, якія суправаджаюць асноўныя этапы пахавальна-памінальных абрадаў, у тым ліку і заключную яго частку.

Памерлага выносілі з хаты ўперад нагамі і адразу ж перакульвалі табурэткі або лаўкі, на якіх стаяла труна. Прычым існавалі два варыянты: перавярнуць абедзве табурэткі ўверх нагамі ці толькі адну і паставіць яе ніцма на другую. Змест гэтага дзеяння быў адзін і той жа: не даць смерці раней за жывых «заняць» гэта месца і «забраць» яшчэ каго-небудзь з сям'і. Як толькі жалобная працэсія скіроўвалася да могілак, нехта са сваякоў памерлага перамешваў зерне розных сельскагаспадарчых культур так, каб тое, якое было знізу, аказалася зверху, і наадварот, каб смерць аднаго з членаў сям'і не адбілася неўраджаем, а значыцца, яшчэ большымі стратамі і бедамі.

Узвышша над магілай таксама мела форму асвоенай прасторы (прамавугольніка), аднак структурныя гарызонты зямлі падчас засыпання магілы мяняліся месцамі. Дзёран і чарназём кідалі на дно магілы, а зверху ўтваралі ўзвышак з жоўтага або белага пяску, у якім зерне не магло прарасці новым коласам.

На Піншчыне вядомы яшчэ адзін рытуал пераварочвання ў заключнай частцы пахавальнага абраду. За труной звычайна неслі гаршчок з вадой, якой святар крапіў магілу. Рэшткі вады вылівалі, а гаршчок пераварочвалі і клалі на магілу ў галовах. Тое ж рабілі і з місай або гліняным гаршком, у якім следам за нябожчыкам неслі палаючыя вугольчыкі. Сані або калёсы, на якіх везлі труну з нябожчыкам, таксама пераварочвалі і пакідалі ў такім стане да саракавін побач з могілкамі або непадалёк ад вёскі. Пераважная большасць згаданых рытуалаў мела папераджальны характар. Жывыя экраніравалі смерць і праз пэўныя абрадавыя дзеянні імкнуліся пазбегнуць новых ахвяр.

Важную ролю прынцып перавернутасці выконваў і ў структуры першага памінальнага стала, які звычайна рабіўся на трэці дзень пасля смерці чалавека або адразу ж пасля вяртання з могілак: за трэцім разам кілішак трэба было перавярнуць і паставіць. Гэтым рытуальным дзеяннем самы старэйшы чалавек за сталом паказваў заканчэнне памінальнай трапезы. І зноў жа — свайго роду экраніраванне жывых ад смерці.

Сістэматызацыя рытуалаў перакульвання прадметаў у пахавальна-памінальнай абраднасці дазваляе зразумець асаблівасць мацавання рамак з фотаздымкамі ў вясковых хатах. Калі ў рамцы змешчаны фотакарткі жывых суродзічаў, то яна будзе вісець паралельна сцяне, строга вертыкальна (усё жывое цягнецца да сонца, падпарадкоўваецца рытмам яго актыўнасці); калі ж там будуць партрэты бабулі і дзядулі, якія даўно памерлі, то яна будзе вісець нахіленая пад вуглом да падлогі.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Дасылайце свае пытанні пра карані і прыстасаванасць да сучаснага жыцця каляндарных і сямейна-побытавых народных традыцый і абрадаў на паштовы або электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

Разбураем міф

Ці трэба есці перад сном?

Многія ўпэўнены ў тым, што перакус перад сном — самая страшная звычка, якая вядзе да атлусцення і адбівае сон. Яшчэ некалькі гадоў таму вучоныя з Сіднейскага ўніверсітэта разбурылі гэты міф. Бо арганізм уначы хоць і працуе ў эканомрэжыме, але яму ўсё ж неабходная энергія.

Яна патрабуецца мозгу, які нават у сне «спальвае» з дзясятак калорый у гадзіну. А калі арганізм доўгі час энергію не атрымлівае, то ён вымушаны «падкрадаць» яе з запасаў мускулатуры, што можа парушыць абмен рэчываў. Таму позні перакус урачы адабраюць. Толькі не пазней, чым за гадзіну да сну, і не больш за 250 кілакалорый. А галоўнае — есці пажадана тыя прадукты, якія дапамагаюць выпрацоўваць «гармон сну» мелатанін.

Перцы, вінаград, абястлушчаны тварог, яйкі, аўсянка (з высокім утрыманнем клятчаткі), соевае малако, аўсянае печыва ці рыба з памідорамі — усе прадукты ўтрымліваюць вялікую колькасць трыптафану. Гэта незаменная кіслата, з якой арганізм вырабляе сератанін, а з яго мелатанін — гармон, які дапамагае заснуць.

Сур'ёзныя праблемы са сном назіраюцца ў кожнага трэцяга чалавека на планеце. Каб спаць моцна, трэба класціся спаць рана. Рэч у тым, што з дзевяці вечара да гадзіны ночы арганізм выпрацоўвае максімальную колькасць мелатаніну. А вырабляюць яго кішэчнік, сятчатка і адзін з аддзелаў мозга.

А яшчэ паветра ў спальнях не павінна быць вышэй за 20 градусаў. Тады тэрмарэгуляцыя цела працуе правільна. Таму, каб спаць добра, варта прыняць цёплы душ, праветрыць спальню і класціся на левы бок. Аказваецца, гэта адна з самых карысных поз. А за паўгадзіны да сну неабходна выключыць тэлевізар, смартфон і ноўтбук.

На салёненькае пацягнула...

Што пагражае аматарам солі

Штодзённая бяспечная норма солі, устаноўленая Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя, — 5 грамаў. Гэта чайная лыжка без «горачкі». Але многія не разумеюць, што гэта лыжка ўжо ўтрымліваецца, напрыклад, у 300 грамах сыру ці каўбасы, у двух марынаваных агурках ці трох кавалках селядца. І таму кожны з нас штодзень з'ядае 10, а то і 15 грамаў солі. Прычым нават тыя, хто, здавалася б, адмовіўся ад відавочна салёных прадуктаў.

Сухарыкі і чыпсы не ўжываюць многія, але мала хто выключае з рацыёну такія асноўныя носьбіты лішняй солі, як каўбасы, сыр і чорны хлеб. І гэта агульнасусветная праблема. У Вялікабрытаніі і ЗША солі ўжываюць у два разы больш за норму. А ў Японіі нашу ежу нават падсольвалі б: там дозу перавышаюць у чатыры разы.

Не трэба забываць, што соль ёсць амаль ва ўсіх прадуктах. Гэта самы старажытны ўзмацняльнік смаку і... аб'ёмаў продажаў. Тым часам соль — гэта адна з асноўных прычын захворванняў сэрца, нырак, павышанага артэрыяльнага ціску і іншых хвароб. Менш солі — даўжэйшае жыццё.

Дык як жа соль з папулярнай прыправы ператвараецца ў забойцу?У нармальным стане пры ціску 120 на 80 і добрым абмене рэчываў у крыві ўтрымліваецца менш за 1 % солі (0,9 %). Калі салёнага пераесці, гэта колькасць павялічыцца, скажам, яшчэ на 1 %. Адразу ж захочацца аднавіць баланс — выпіць вады і піць яе, пакуль баланс не прыйдзе ў норму. Колькасць крыві пры гэтым павялічыцца, таму што яна разбаўлена вадой. А нашы сасуды не гумавыя — ціск адразу «скокне», і гэта прывядзе да гіпертаніі і іншых хвароб сэрца.

Калі сасуды трацяць эластычнасць і ў іх з'яўляюцца мікратрэшчыны, то халестэрынавыя бляшкі ўтвараюцца нашмат хутчэй. Зрэшты, канадскія вучоныя даказалі, што небяспечны не толькі лішак солі ў арганізме, але і яе недахоп. Соль неабходная для вытворчасці гідраэлектрычнай энергіі ва ўсіх клетках. Калі яе мала, энергіі не хапае.

Здароўе. Практычны падыход

НОВАМУ РАЁНУ — НОВАЯ ПАДСТАНЦЫЯ

«Хуткая» стане яшчэ хутчэйшай

Новая падстанцыя хуткай медыцынскай дапамогі адкрылася ў Мінску. Яна размяшчаецца на вуліцы Уладзіслава Сыракомлі ў мікрараёне Лошыца і будзе абслугоўваць каля 150 тысяч мінчан з Ленінскага і Заводскага раёнаў сталіцы. На будаўніцтва патрачана 4,5 мільёна рублёў. І гэта другая падстанцыя ў сталіцы, пабудаваная па такім тыпе.

Напрыклад, усе выклікі паступаюць на камп'ютары дыспетчараў. Брыгада хуткай дапамогі атрымлівае іх у раздрукаваным выглядзе, таксама яны дублююцца на планшэты медыкаў. Памяшканні падстанцыі абсталяваныя селектарнымі апавяшчальнікамі, у тым ліку і пакоі для адпачынку (іх тут 13). Так фельчары могуць аператыўна атрымаць інфармацыю аб тым, што ёсць выклік. Такая ж селектарная сувязь ёсць і ў сталоўцы.

Не толькі сучасныя тэхналогіі, але і само размяшчэнне падстанцыі павінна паспрыяць таму, што «хуткія» будуць за больш кароткі тэрмін прыязджаць на выклік. Паводле нормаў, гэты час не павінен перавышаць 15 хвілін.

На падстанцыі прадугледжаны 12 брыгад: адна педыятрычная, тры брыгады інтэнсіўнай тэрапіі і восем фельчарскіх. Гэта каля 150 медработнікаў і іншых спецыялістаў. Паводле сацыяльнага стандарту, на 12 тысяч гараджан павінна быць адна брыгада хуткай дапамогі. Мінск у гэтыя нарматывы ўпісваецца: для абслугоўвання 2 мільёнаў жыхароў працуе 62 урачэбныя і 105 фельчарскіх брыгад.

— Наш прыярытэт — забяспечыць насельніцтва даступнай, сучаснай і якаснай хуткай медыцынскай дапамогай, — адзначыў падчас урачыстага адкрыцця падстанцыі **намеснік старшыні Мінгарвыканкама Арцём ЦУРАН.** — Гэта не толькі аб'ект аховы здароўя, які доўга будзе служыць мінчанам, але і месца работы з дастойнымі ўмовамі для медработнікаў.

На адкрыцці госці маглі ацаніць прастор і зручнасць размяшчэння аб'ектаў: дыспетчарскай, памяшкання для папаўнення медыкаментаў, праверкі медыцынскай апаратуры, пакояў для прыёму ежы і адпачынку персаналу, душавых, канферэнц-залы. Адметна, што жыхары навакольных раёнаў могуць кругласутачна звяртацца па экстранную і неадкладную медыцынскую дапамогу ў кабінет, спецыяльна прызначаны для прыёму амбулаторных пацыентаў, размешчаны на першым паверсе.

Фота БелТА.

Аўтамабілі хуткай дапамогі ўтрымліваюцца ў сучасным гаражы ў боксах з ацяпленнем — так яны будуць пастаянна гатовы да тэрміновага выезду без пагрэву рухавіка нават у зімовы час. Тут жа можна захоўваць медыцынскую тэхніку і падзараджаць яе перад выездамі. На паркоўцы нават абсталяваны зліў — зімой, калі на колах застаецца шмат снегу, тут не будзе лужын.

Дарэчы, падстанцыя ўкамплектаваная аўтамабілямі, — іх 12 — пераведзенымі са сталічных падстанцый №№ 1, 3 і 5. Мінскія «хуткія» закуплялі ся ў перыяд з 2016 да 2019 года — па 40 у год. Наступнае абнаўленне сталічнага аўтапарка плануецца ў наступныя пяць гадоў.

Падстанцыю пабудаваў будтрэст № 1. Яна стала другой, узведзенай па такім праекце. У 2014 годзе падобная была адкрыта ў Каменнай Горцы. Такі ж праект ёсць у Брэсце, яшчэ адзін цяпер рэалізуецца ў Баранавічах. Сучасныя падстанцыі дазваляюць палепшыць умовы работы медперсаналу, адзначыў **намеснік міністра аховы здароўя Вячаслаў ШЫЛА.** А задача мясцовых органаў аховы здароўя — максімальна набліжаць іх да тых раёнаў горада, якія маюць у гэтым патрэбу.

— Адкрыццё падстанцыі звязана з развіццём горада і яго інфраструктуры. Цяпер развіваецца Ленінскі раён, і таму прынялі рашэнне пабудаваць падстанцыю тут, — растлумачыў **старшыня камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Сяргей МАЛЫШКА.** — У канцэпцыі развіцця першаснай медыцынскай дапамогі Мінска запланаваны яшчэ дзве падстанцыі, якія з'явяцца ў мікрараёне Уручча і Маскоўскім раёне. Іх пабудуюць у найбліжэйшыя пяць гадоў.

Амаль 60 тысяч долараў

Такі грант выдзелены 19-й Цэнтральнай раённай паліклініцы Мінска ад урада Японіі

Беларусь рэалізуе праграму ўрада Японіі «Карані травы» — грантавая дапамога для праектаў па забеспячэнні бяспекі чалавека. У яе межах японскі бок выдзяляе гранты з мэтай падтрымкі людзей, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС і яе наступстваў.

Учора адбылася ўрачыстая цырымонія падпісання кантракта на выдзяленне гранта для 19-й Цэнтральнай раённай паліклінікі Першамайскага раёна Мінска. Установа аховы здароўя атрымала дапамогу на суму 59 330 долараў ЗША для закупкі сучаснага апарата УГД.

У цырымоніі ўзяў удзел **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Японіі ў Рэспубліцы Беларусь Хірокі ТАКУНАГА,** які і ўручыў адпаведны сертыфікат галоўнаму ўрачу паліклінікі Веры Стасевіч.

Гэты праект стаў 52-м па ліку, рэалізаваным у межах праграмы «Карані травы». Агульная сума грантаў, выдзеленых Беларусі з 2004 па 2020 год, складае 4 028 505 долараў ЗША.

Нягледзячы на тое што большасць раней рэалізаваных праектаў датычыліся ўстаноў аховы здароўя, праекты ў іншых галінах таксама могуць удзельнічаць у конкурсе. Заяўкі на ўдзел у праграме пасольства Японіі ў Рэспубліцы Беларусь прымае з 1 студзеня да 31 жніўня, кансультацыі па пытаннях удзелу ажыццяўляюцца пастаянна.

КУПАЛА КРОЧЫЦЬ ПА ПАДНЯБЕСНАЙ

Народны паэт прычыніўся да інавацыйнага праекта БДУ

Узаемадзеянне Беларусі з Кітайскай Народнай Рэспублікай развіваецца цягам амаль трох дзесяцігоддзяў.

Эканамічны эфект супрацоўніцтва з Паднябеснай відавочны. Актыўна пашыраецца яно ў сацыяльнай сферы, у прыватнасці, у сістэме адукацыі. Адзін з яскравых прыкладаў — кітайскі вектар найбуйнейшага адукацыйнага, навукова-вытворчага цэнтра нашай краіны — Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. 2019, які, дарэчы, быў абвешчаны Годам адукацыі Беларусі ў Кітаі, у плане рэалізаваных магчымасцяў шмат у чым стаў знакавым для БДУ. Якія ж адукацыйныя трэнды набылі ўвасабленне?

Рэктар БДУ Андрэй КАРОЛЬ і дырэктар падрыхтоўчага цэнтра ўніверсітэта ў Санья ЧЖАН ЛЭЙ падчас адкрыцця кабінета беларускай мовы і культуры імя Янкі Купалы.

КРЭАТЫЎ АД СУМЕСНАГА ІНСТЫТУТА

У БДУ атрымліваюць адукацыю, якая адпавядае ўсім сучасным стандартам, звыш 3,7 тысячы замежнікаў з больш чым 60 краін. Сярод іх — Аўстралія, ЗША, Канада, Германія, Японія, Вялікабрытанія, Францыя, Швейцарыя, Турцыя, Шры-Ланка, Сірыя, Лівія, Кот-д'Івуар, Эквадор, Тога. Пералічваць, вядома, можна яшчэ доўга. Канешне ж, навучаюцца ў БДУ і грамадзяне дзяржаў постсавецкай прасторы. Найбольш прадстаўнічая «дэлегацыя» — 1889 чалавек, — навучэнцы з Паднябеснай. 365 кітайцаў займаюцца ў магістратуры, 89 — у аспірантуры. Найбольш запатрабаваныя эканамічны і філалагічны факультэты, а таксама факультэты журналістыкі і міжнародных адносін.

З 2007-га БДУ развівае плённае супрацоўніцтва з Далянскім політэхнічным універсітэтам (ДПУ). Як паведаміў **начальнік упраўлення міжнародных сувязяў БДУ Аляксандр ЖУК,** тры гады таму была адкрыта першая ў нацыянальнай сістэме беларуска-кітайская ВНУ — сумесны інстытут ДПУ-БДУ. Летась у яго паступілі 78 студэнтаў. З іх 40 — на спецыяльнасць «Інжынерная механіка», 38 — «прыкладная фізіка». Усяго ў сумесным інстытуце цяпер навучаюцца 244 студэнты. У яго склад уваходзяць тры факультэты — прыкладной фізікі, інжынернай механікі, а таксама матэматыкі і прыкладной матэматыкі. Адметна, што навучанне з удзелам выкладчыкаў БДУ вядзецца на англійскай мове.

З 1 верасня бягучага года на базе БДУ пачаў работу сумесны беларуска-кітайскі інстытут БДУ-ДПУ (СІБД). Гэта першы вопыт у айчыннай сістэме вышэйшай адукацыі ў галіне сумеснай падрыхтоўкі спецыялістаў першай ступені на базе беларускай ВНУ. Выпускнікі інстытута будуць запатрабаваныя прамысловымі, адукацыйна-навуковымі прадпрыемствамі Беларусі і Кітая, а таксама ў індустрыяльным парку «Вялікі камень».

Падрыхтоўка тут вядзецца па такіх спецыяльнасцях, як «сусветная эканоміка», «фізіка (вытворчая дзейнасць)», «механіка і матэматычнае мадэляванне». У далейшым мяркуецца павялічыць пералік спецыяльнасцяў, а таксама адкрыць падрыхтоўку ў магістратуру. Цяпер на першым курсе навучаецца больш паўсотні студэнтаў. Сёлета набор плануецца павялічыць.

Усе навучальныя планы і праграмы навучальных дысцыплін распрацоўваюцца і зацвярджаюцца пры ўдзеле двух бакоў і актуалізуюцца ў адпаведнасці з апошнімі дасягненнямі навукі, тэхнікі і прамысловасці краін — удзельніц адукацыйнага праекта. Выпускнікі сумеснага беларуска-кітайскага інстытута атрымаюць два дыпломы — БДУ і ДПУ. У прафесарска-выкладчыцкі склад СІБД увойдуць прадстаўнікі беларускага і кітайскага ўніверсітэтаў. Летась у студзені паміж двума ўніверсітэтамі падпісана пагадненне аб стварэнні навукова-інавацыйнага цэнтра. Ён быў адкрыты ўжо ў чэрвені 2019-га. Мяркуецца, што ў гэтым цэнтры з выкарыстаннем сучаснага навукова-лабараторнага абсталявання будуць праходзіць практыку і студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Таксама супрацоўніцтва БДУ—ДПУ прадугледжвае правядзенне шэрагу сумесных мерапрыемстваў. У прыватнасці, у студзені мінулага года на базе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта была арганізавана грунтоўная Зімовая школа. Для студэнтаў з Кітая былі зладжаны лекцыі па праблемах сучаснай фізікі, матэматыкі, механікі. У навуковых і вучэбных лабараторыях факультэтаў БДУ прайшлі творчыя заняткі па спецыяльнасцях «фізіка (вытворчая дзейнасць)», а таксама «механіка і матэматычнае мадэляванне». А ў чэрвені 2019-га на базе Далянскага політэхнічнага ўніверсітэта была арганізавана Летняя школа. Яе слухачамі сталі 20 студэнтаў механіка-матэматычнага і фізічнага факультэтаў БДУ. Праграма школы ўключала вывучэнне сучасных праблем прыкладной фізікі і механікі, заняткі прайшлі ў даследчай лабараторыі ДПУ.

Цяпер узаемадзеянне БДУ з універсітэтамі і навуковымі інстытутамі Кітая ладзіцца ў межах 77 двухбаковых дакументаў (мемарандумаў, пагадненняў, праграм супрацоўніцтва). Напрыклад, партнёрамі, апроч ужо згаданых, з'яўляюцца Пекінскі, Хэнанскі, Фашанскі, Усходне-Кітайскі педагагічны ўніверсітэты, Шанхайскі ўніверсітэт транспарту, а таксама Харбінскі ўніверсітэт навукі і тэхналогій, Кітайскі ўніверсітэт міжнародных адносін і шэраг іншых. Летась падпісана 12 двухбаковых дакументаў з установамі адукацыі КНР. Асобныя былі накіраваны на пашырэнне партнёрскіх адносін. Сярод іх — пагадненне аб абмене навучэнцамі з Далянскім політэхнічным універсітэтам. Летась БДУ пашырыў кола сваіх партнёраў у Кітаі. Асобна тут варта адзначыць падпісанне мемарандума аб узаемаразуменні з Пекінскім універсітэтам — адной з вядучых ВНУ Паднябеснай.

Начальнік упраўлення міжнародных сувязяў БДУ Аляксандр ЖУК і кіраўнік інфармацыйна-адукацыйнага цэнтра ўніверсітэта ў Кітаі Ван ЯАЦЯН абмяркоўваюць перспектывы супрацоўніцтва.

РЫЗЫКНУЦЬ І ВЫЙГРАЦЬ

Насамрэч, крэатыўным і іміджавым для Белдзяржуніверсітэта стаў праект, у межах якога ў канцы 2017 года ў Пекіне быў адкрыты інфармацыйна-адукацыйны цэнтр БДУ. Яго к**іраўніком і каардынатарам стаў Ван ЯАЦЯН**. Ён, дарэчы, выпускнік БДУ, у Мінску абараніў кандыдацкую па эканамічным профілі і вырашыў не губляць сувязі з альма-матэр, а, наадварот, паглыбляць узаемадзеянне. «Было вялікае жаданне расказаць пра Беларусь, яе адукацыйныя магчымасці, — кажа Ван Яацян. — Дагэтуль кітайцы добра ведалі пра магчымасць атрымаць адукацыю ў Еўропе, Расіі, ЗША. Пра той жа БДУ было зусім няшмат інфармацыі. А між тым універсітэт знаходзіцца на высокіх пазіцыях у сусветным рэйтынгу. Якасць адукацыі тут адпавядае міжнародным стандартам, я ў гэтым асабіста пераканаўся».

Для БДУ арганізацыя цэнтра ў Паднябеснай — смелы эксперымент, у якім была немалая доля рызыкі. Аднак такі інавацыйны падыход да рэкрутынгу студэнтаў сябе апраўдаў. Пра гэта сёння можна казаць з упэўненасцю. «Ужо менш чым праз год пасля адкрыцця базавага «пункта» ў кітайскай сталіцы — у верасні 2018-га — была набрана першая група навучэнцаў. Падрыхтоўчы цэнтр БДУ з'явіўся ў вядомым горадзе Санья, што на востраве Хайнань, — адзначае Аляксандр Жук. — Ён быў створаны з мэтай моўнай падрыхтоўкі кітайскіх абітурыентаў, якія плануюць паступленне ў БДУ. Першая група — 60 чалавек — з верасня прыступіла да навучання на журфаку».

Сёння ў падрыхтоўчым цэнтры ў Санья навучаецца ўжо 140 слухачоў па вучэбных праграмах беларускага ВНУ. Ужо ў пачатку сакавіка гэтая група прыедзе ў Мінск і працягне навучанне ў БДУ. Адбор у цэнтры адбываецца на конкурснай аснове з удзелам прадстаўнікоў 17 школ, трох універсітэтаў 12 правінцый Кітая. Уся інфраструктура ў Санья нагадвае пра беларускія рэаліі. Вучэбныя кабінеты маюць назвы станцый метро Мінска, сцены ўпрыгожаны фатаграфіямі, калажамі і карцінамі з выявамі беларускіх асветнікаў, славутых турыстычных месцаў і рэгіёнаў. Кітайскім слухачам даступны фонд фільмаў, прэзентацый, твораў беларускіх пісьменнікаў, перыёдыкі, спіс якіх рэгулярна будзе папаўняцца пры падтрымцы БДУ. Адным з важных кірункаў работы цэнтра з'яўляецца сацыякультурная адаптацыя замежных грамадзян перад іх навучаннем у нашай краіне. Гэтая ўстанова праз адукацыйную дзейнасць актыўна садзейнічае распаўсюджванню інфармацыі пра Беларусь у Кітаі.

Летась у лістападзе адбылася знакавая падзея — у падрыхтоўчым цэнтры БДУ з'явіўся кабінет беларускай мовы і культуры імя Янкі Купалы. Урачыстая цырымонія адкрыцця імянной аўдыторыі Песняра прайшла пры ўдзеле дэлегацыі беларускай ВНУ на чале з рэктарам Андрэем Каралём, дырэктара падрыхтоўчага цэнтра Чжан Лэя, слухачоў і выкладчыкаў. Адбылося тэатралізаванае прадстаўленне кітайскіх навучэнцаў, якія падрыхтавалі музычна-танцавальныя нумары, вершы і песні на беларускай, рускай і кітайскай мовах. Цяпер слухачы падрыхтоўчага цэнтра маюць цудоўную магчымасць папрацаваць з арыгінальнымі матэрыяламі па лінгвістыцы, гісторыі, мастацтве і краіназнаўстве Беларусі. Плануецца, што тут будуць арганізоўвацца адукацыйна-культурныя мерапрыемствы профільнай тэматыкі.

А яшчэ ў планах — пашырэнне сеткі падрыхтоўчых цэнтраў БДУ ў Паднябеснай Сёлета, як мяркуецца, адпаведныя ўстановы будуць адкрыты ва Ухані, а таксама ў кітайскай сталіцы. Так што інавацыі пашыраюцца.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА і з архіва БДУ.

❍ Даслоўна

Рэктар БДУ Андрэй КАРОЛЬ:

З упэўненасцю адзначу, БДУ сёння — лідар беларуска-кітайскага супрацоўніцтва па шэрагу перспектыўных кірункаў. Галіна адукацыі тут не выключэнне. Сёння кожны трэці кітайскі студэнт, які навучаецца ў беларускіх ВНУ, — вучыцца ў БДУ. Наш Рэспубліканскі інстытут кітаязнаўства імя Канфуцыя стаў першым Узорным інстытутам Канфуцыя сярод інстытутаў кітаязнаўства краін СНД і адзіным, які атрымаў права за межамі Кітая праводзіць міжнародны кваліфікацыйны экзамен для перакладчыкаў CATTI.

Больш за 12 працэнтаў ад агульнай колькасці ўсіх міжнародных пагадненняў у галіне адукацыі і навукі ў нас заключана з кітайскімі ўстановамі. Штогод адзначаецца павелічэнне колькасці слухачоў факультэта даўніверсітэцкай адукацыі БДУ з ліку кітайскіх грамадзян. Гэтаму спрыяе створаная інфраструктура экспарту адукацыйных паслуг. Калі ў 2017/2018 навучальным годзе мы налічвалі на падрыхтоўчым аддзяленні ФДА 287 чалавек, то цяпер іх ужо 596, з якіх — 580 з КНР. А гэта патэнцыйныя студэнты БДУ і значныя інвестыцыі ў нашу краіну.

Новыя перспектывы з Кітаем бачацца ў пашырэнні спектру сумеснай падрыхтоўкі спецыялістаў і развіцці культурных сувязяў. У найбліжэйшы час прапануем кітайскім калегам праграмы павышэння кваліфікацыі для работнікаў сістэмы адукацыі ў галіне крэатыўнага і эўрыстычнага навучання. Эўрыстычныя тэхналогіі дазваляюць навучэнцам паглядзець на сябе з боку, адкрыць сябе і свае магчымасці, праверыць межы свайго няведання. Таму сёння такое навучанне вельмі запатрабаванае ў свеце. Новыя адукацыйныя падыходы накіраваны не на ўзнаўленне і засваенне ўсіх дасягненняў чалавецтва, а на стварэнне студэнтам свайго прадукту, адрознага ад таго, што зрабіў яго аднагрупнік; цяпер вучаць задаваць пытанні, а не даваць аднолькавыя адказы. Гэтыя інавацыі мы актыўна выкарыстоўваем у БДУ для павышэння якасці адукацыі.

Наш вопыт у гэтым кірунку зацікавіў кітайскіх калег падчас візіту ў падрыхтоўчы цэнтр у Санья. Ужо ёсць дамоўленасць, што першымі слухачамі праграмы павышэння кваліфікацыі стануць нашы калегі з навучальных устаноў гэтага горада. Кабінет беларускай мовы і культуры імя Янкі Купалы, які працуе ў цэнтры, — адметны культурна-адукацыйны цэнтр Беларусі ў КНР. Ён спрыяе папулярызацыі беларускай гісторыі, літаратуры, нашых нацыянальных традыцый, асаблівасцяў, славутасцяў сярод кітайскіх грамадзян. Упэўнены, такія структуры маюць добрую будучыню. Кітайскія слухачы разам з падрыхтоўкай да паступлення ў БДУ адчуваюць сацыякультурную атмасферу Беларусі. Пашырэнне ведаў пра нашу краіну цягне за сабой прырост замежных грамадзян, умацоўвае дзяржаўны імідж за мяжой. Дарэчы, па выніках візіту ў Санья набор кітайскіх слухачоў для падрыхтоўкі да паступлення ў БДУ павялічаны да 500 чалавек. Перакананы, што і гэта не максімум.

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Рапс» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже:

лот № 1: имущество в составе:

здание автогаража с бетонной площадкой и ограждением (в состав входят: здание автогаража с бетонной площадкой и ограждением, пристройка, площадка, ограждение) **с инвентарным номером № 600/С-121223 общей площадью 774,3 кв. м,** расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623683900001000140 площадью 0,6032 га по адресу: Минская область, Минский район, Крупицкий с/с, 7, район д. Аннополь, и **здание пропускного пункта с инвентарным номером № 600/С-121220 общей площадью 21,7 кв. м,** расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623683900001000143 площадью 0,0249 га по адресу: Минская область, Минский район, Крупицкий с/с, район д. Аннополь.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 233 109,72 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **23 310,00 бел. руб.**).

Условия продажи:

- улучшение эстетического вида объекта, благоустройство земельного участка, отведенного для обслуживания недвижимого имущества, и наведение на нем порядка в течение трех месяцев с момента подписания акта приема-передачи недвижимого имущества;
- поддержание надлежащего санитарного, технического состояния недвижимого имущества и земельного участка в течение всего срока использования (эксплуатации) объекта до его сноса (гибели);
